СОНЦА:
Усход, захад, даўжыня дня:
Мінск — 7.19, 16.28, 9.09;
Віцебск — 7.13, 16.13, 9.00;
Магілёў — 7.08, 16.17, 9.09;
Гомель — 7.03, 16.17, 9.14;
Гродна — 7.35, 16.42, 9.07;
Брэст — 7.29, 16.49, 9.20.
МЕСЯЦ:
Першая квадра 2 лістапада.
ІМЯНІНЫ
Феафіла, Апанаса.

ЗВЯЗДА

6 ЛІСТАПАДА 1992 г.
пятніца, № 225 (22003)
● выдаецца са жніўня 1917 г. ● БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА ● цана 1 рубель

ВОЗГАЛАС

355 ПРАЦЭНТАЎ — ГЭТА ВАМ НЕ ЖАРТАЧКІ

Менавіта на столькі павялічыла колькасць падпісчыкаў «Звязды» ў Гомельскай вобласці па стану на 1 лістапада ў параўнанні з 1 студзеня 1992 года, і наша чытацкая аўдыторыя на Гомельшчыне ў наступным годзе будзе налічваць 31.044 чалавекі. У некаторых іншых газет паказчыкі (таксама ў працэнтных адносінах) больш сціплыя: «Народная газета» — 83.572 экземпляры (212%), «Советская Белоруссия» — 75.974 экземпляры (168%) і «Белорусская ніва» — 14.440 экземпляраў (100,1%).

Канешне, прыемна, што на Гомельшчыне ў нас будзе ў тры з палавінай разы больш сяброў і аднадумцаў. Мы ж са свайго боку пастараемся апраўдаць іх давер.

«ПАСТАНОВА ЎЗАКОНЬВАЕ ЗВЫШУРОЧНУЮ РАБОТУ...»

Учора на ранішнім пасяджэнні сесіі Вярхоўнага Савета разглядалася пытанне аб невыкананні ўрадам рэспублікі Закона аб адукацыі ў поўным аб'ёме. Дэпутаты абмяркоўвалі два праекты пастановы па артыкулу 34 — Саўміна і дэпутацкай камісіі ВС. У выніку пайменнага галасавання была прынята пастанова, падрыхтаваная Саветам Міністраў рэспублікі. Згодна з ёй, сярэдняя заработная плата педагагічных работнікаў павінна быць не меншай за сярэднюю заработную плату служачых у прамысловасці (а зарплата прафесарска-выкладчыцкага саставу — у 1,5 раза большай). Вырашана таксама пачынаючы з IV квартала 1992 года праводзіць паквартальную карэкціроўку разрадаў і тарыфных каэфіцыентаў педработнікаў з улікам сярэднямесячнага заработку служачых прамысловасці.

Прынятая сесіяй ВС пастанова адразу ж была размножана і перададзена настаўнікам, якія, нягледзячы на непагадзь, зноў прыйшлі на плошчу Незалежнасці. Якой была рэакцыя?

— Прынятае дэпутатамі рашэнне нас задаволіць не можа: чаму ў пастанове размова ідзе не пра стаўку зарплаты, а пра заработную плату? Чаму мы павінны працаваць на паўтары стаўкі — літаральна на знос,— і якой пры гэтым будзе якасць нашых урокаў, якія веды атрымае вучань?

— Гэтай пастановай дэпутаты фактычна ўзаконьваюць звышурочную нагрузку настаўніка. І гэта называецца выкананнем Закона аб адукацыі?! Мы пакідаем за сабой права на забастоўку.

Настаўнікі, як відаць, не задаволены рашэннем сесіі ВС. Застаецца спадзявацца, што ўсе праблемы яны будуць вырашаць цывілізаваным шляхам.

Таццяна ПАДАЛЯК.

ЎСЕ МЕНШ, І МЕНШ, І МЕНШ

МІНСКАЯ ВОБЛАСЦЬ. З пачатку года аб'ём прамысловай прадукцыі на прадпрыемствах Міншчыны зменшыўся больш чым на 2,2 мільярда рублёў, у тым ліку амаль на 2 мільярда — прадукцыі машынабудавання, 56 мільёнаў — лёгкай, 13,8 мільёна — лясной і дрэваапрацоўчай прамысловасці. Акрамя таго, у сувязі са спыненнем вытворчасцей і пераходам на іншы рэжым работы з пачатку года звольнена 900 чалавек прамыслова-вытворчага персаналу.

ЯШЧЭ АДНО НАРАДЖЭННЕ...

«Вялікага хакея чакаць засталося нядоўга», — пісала летам «Звязда». Сёння мы паведамляем: вялікі хакей прыйшоў на Беларусь. Кваліфікацыйны турнір трох зборных — Беларусі, Украіны і Казахстана — вызначыць дзве каманды, якія ў наступным годзе прымуць удзел у чэмпіянаце свету сярод каманд групы «С».

На жаль, сёння мы пакуль не можам апублікаваць саставы нацыянальнай зборнай нашай краіны, бо ў чацвер раніцай галоўны трэнер У. Сафонаў яшчэ не вызначыў яго. Аднак відавочна, што аснову каманды складуць хакеісты мінскага «Дынама», будуць задзейнічаны таксама ігракі гродзенскага «Нёмана» і наваполацкага «Хіміка». Апошняя надзея на легіянераў пайшла марна: Грыбко, Старасценка, Баршчэўскі, Фёдараў — выхаванцы беларускага хакея — уключаны ў саставы першай або другой расійскай зборнай. Праўда, спадзяюцца на прыезд у Мінск Андрэя Дзмітрыева і Сяргея Хаткевіча — былых ігракоў «Дынама», якія зараз выступаюць у адным з германскіх клубаў.

Шанцы трох зборных аднолькавыя: яўных фаварытаў або аўтсайдэраў няма.

Вось якая раскладка матчаў. **Пятніца, 6 лістапада.** У 18.30 на ледавую пляцоўку Палаца спорту выйдуць зборныя **Казахстана і Украіны. У суботу** сустрэнуцца **Беларусь і Украіна, а 8 лістапада — Беларусь і Казахстан.** Два апошнія матчы пачнуцца ў 17 гадзін.

Паведамляем таксама, што на турнір прыбыў генеральны сакратар Міжнародная федэрацыі хакея.

Анатоль СЛАНЕЎСКІ.

УРАДАВАЯ

Камісія Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь па каардынацыі работы і аператыўнаму вырашэнню пытанняў паралельнага абарачэння рублёў і разліковых білетаў Нацыянальнага банка прыняла рашэнне і даводзіць да ведама.

Першае: У сувязі з выхадам краін Балтыі, Украіны з рублёвай зоны, з мэтай абароны спажывецкага рынку Рэспублікі Беларусь увесці пачынаючы з 10 лістапада 1992 года парадак разлікаў за ўсе харчовыя тавары, уключаючы тытунёвыя і вінна-гарэлачныя вырабы на прадпрыемствах рознічнага гандлю ўсіх форм уласнасці толькі за разліковыя білеты Нацыянальнага банка. У грамадскім харчаванні захоўваецца існуючы парадак разлікаў.

Другое: Па прычыне адсутнасці купюры разліковага білета менш 50 капеек, роўных 5 рублям, для зручнасці ў ажыццяўленні разлікаў выкарыстоўваюцца рублёвыя банкноты вартасцю ў 1 і 3 рублі, якія ў якасці самастойнага плацежнага сродку пры разліках за харчовыя тавары не прымаюцца.

Трэцяе: Камерцыйным банкі забяспечваюць выдачу сродкаў на заработную плату, аплату працы ў калгасах, пенсіі, дапамогі, стыпендыі, іншыя плацяжы насельніцтву разліковымі білетамі ў размерах, заяўленых кліентамі, але не больш за 80 працэнтаў ад агульнай сумы зарплаты (даходу), пенсіянерам (па іх жаданню) пенсія можа выдавацца разліковымі білетамі ў размеры 100 працэнтаў.

Чацвёртае: Абмен рублёў на разліковыя білеты жыхарам Беларусі робіцца па месцы атрымання зарплаты (даходу), а таксама ў ашчадных банках у суме не больш за 5 тысяч рублёў у месяц без спагнання камісійнага збору.

Абмен рублёў на разліковыя білеты для жыхароў іншых дзяржаў, прыбыўшых у Беларусь у камандзіроўку, робіцца прадпрыемствамі, куды яны камандзіраваны, у размеры не больш за 250 рублёў (25 разліковых білетаў) у дзень без спагнання камісійнага збору.

Грамадзянам, якія прыбылі ў Беларусь па іншых прычынах, абмен рублёў на разліковыя білеты робіцца банкамі ў размеры да 2 тысяч рублёў (200 разліковых білетаў) адначасова са спагнаннем камісійнага збору ў размеры 30 працэнтаў.

Пятае: Аблвыканкомам, Мінскаму гарвыканкому, Міністэрству гандлю, Белкаапсаюзу забяспечыць належны кантроль за работай гандлюючых арганізацый ва ўмовах увядзення разлікаў за харчовыя тавары разліковымі білетамі Нацыянальнага банка, прыцягваючы да адказнасці службовых асоб, якія дапускаюць парушэнні ўстаноўленага парадку разлікаў.

Старшыня Урадавай камісіі С. А. БАГДАНКЕВІЧ.

НАШ КАМЕНТАРЫЙ:

Што ж, гэта паведамленне, безумоўна, сенсацыя, але з разраду тых, пра якія гавораць — «чакаемая». Апошнія заявы старшыні Нацыянальнага банка Беларусі Станіслава Багданкевіча ды і проста логіка разумнага сэнсу, здаецца, ужо ўсіх пераканалі, што рана ці позна «зайчыкі» заваюць гандлёвыя прасторы Беларусі. Зараз галоўная праблема толькі ў тым, каб разабрацца, што з гэтага вынікае.

Асноўным пытаннем, што хвалюе не толькі рэспектабельных бізнесменаў, але і простых грамадзян,— ад якой «валюты» (расійскай ці беларускай) хутчэй збаўляцца, бо ёсць сумненні ва ўстойлівасці беларускага разліковага білета. Якая будучыня напаткае «зайчыка?»

Горкая перспектыва ўкраінскага купона ці шчаслівы лёс латышскага рубліса, які стабілізаваўся на ўзроўні 180 рублёў за долар? Начальнік упраўлення арганізацыі грашовага абарачэння Нацыянальнага банка Беларусі Тамара Каржанеўская лічыць, што наш рубель будзе расці адносна расійскага дзякуючы большай насычанасці і таннасці беларускага рынку. Як ускоснае пацвярджэнне яе словам можна прывесці і той факт, што ў Віцебску замежныя студэнты пасля ўвядзення 4 лістапада «зайчыкаў» пачалі прасіць за долар 400 беларускіх рублёў, хоць да ўвядзення не хацелі прадаваць і за 430. Але што зробіш — есці ж хочацца!

***

І яшчэ адна фінансавая інфармацыя. Учора ў Мінску адбылася сустрэча банкаўскіх экспертаў краін СНД, на якой ішла размова аб неабходнасці заснавання Міждзяржаўнага банка. На сустрэчы таксама прысутнічалі прадстаўнікі МВФ і групы Еўрапейскага супольніцтва. Эксперты прыйшлі да згоды адносна неабходнасці стварэння такога Міждзяржаўнага банка. Яны выпрацавалі рэкамендацыі, якія будуць прадстаўлены кіраўнікам краін СНД на іх наступнай сустрэчы. Паводле слоў начальніка ўпраўлення арганізацыі банкаўскага ўліку і разлікаў Георгія Клімовіча, стварэнне Банка зусім не азначае абавязковае захоўванне рублёвай зоны — у яго могуць уваходзіць і краіны з уласнымі валютамі.

Віталь ЦЫГАНКОЎ.

Пастанова Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

Аб прапанове групы грамадзян Рэспублікі Беларусь аб правядзенні рэспубліканскага рэферэндуму

Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь **пастанаўляе:**

У сувязі з парушэннямі ініцыятыўнай групай па правядзенню рэферэндуму артыкулаў 11 і 13 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб народным галасаванні (рэферэндуме) у Рэспубліцы Беларусь» адхіліць на падставе артыкула 14 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб народным галасаванні (рэферэндуме) у Рэспубліцы Беларусь» прапанову групы грамадзян Рэспублікі Беларусь аб правядзенні рэспубліканскага рэферэндуму з фармулёўкай пытання «Ці лічыце Вы неабходным правядзенне ўвосень 1992 года выбараў у вышэйшы орган дзяржаўнай улады Рэспублікі Беларусь на падставе Закона «Аб выбарах народных дэпутатаў Беларусі», праект якога ўнесены апазіцыяй БНФ у Вярхоўным Савеце, і ў сувязі з гэтым датэрміновы роспуск цяперашняга Вярхоўнага Савета?».

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь С. ШУШКЕВІЧ.

29 кастрычніка 1992 г.
г. Мінск.

Пастанова Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

Аб Заяве Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь «Аб неабходнасці паскарэння канстытуцыйных пераўтварэнняў у Рэспубліцы Беларусь»

Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь **пастанаўляе:**

Прыняць Заяву «Аб неабходнасці паскарэння канстытуцыйных пераўтварэнняў у Рэспубліцы Беларусь» і апублікаваць яе ў рэспубліканскім друку (тэкст прыкладаецца).

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь С. ШУШКЕВІЧ.

29 кастрычніка 1992 г.
г. Мінск.

Заява Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

АБ НЕАБХОДНАСЦІ ПАСКАРЭННЯ КАНСТЫТУЦЫЙНЫХ ПЕРАЎТВАРЭННЯЎ У РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ

Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь разгледжана прапанова групы грамадзян Рэспублікі Беларусь аб правядзенні рэспубліканскага рэферэндуму з фармулёўкай пытання «Ці лічыце Вы неабходным правядзенне ўвосень 1992 года выбараў у вышэйшы орган дзяржаўнай улады Рэспублікі Беларусь на падставе Закона «Аб выбарах народных дэпутатаў Беларусі», праект якога ўнесены апазіцыяй БНФ у Вярхоўным Савеце, і ў сувязі з гэтым датэрміновым роспускам цяперашняга Вярхоўнага Савета?».

Паважаючы права грамадзян Рэспублікі Беларусь на прыняцце рашэнняў па найбольш важных пытаннях дзяржаўнага і грамадскага жыцця спосабам правядзення народнага галасавання (рэферэндуму), Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь лічыць неабходным заявіць, што рэалізацыя ініцыятывы грамадзян на правядзенне рэспубліканскага рэферэндуму павінна ажыццяўляцца ў дакладнай адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь выступае за правядзенне радыкальных пераўтварэнняў ва ўсіх галінах палітычнага і сацыяльна - эканамічнага жыцця рэспублікі. Грунтуючыся на канстытуцыйных палажэннях Дэкларацыі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь аб дзяржаўным суверэнітэце Рэспублікі Беларусь, Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь пацвярджае сваю прыхільнасць да

(Заканчэнне на 2-й стар.).

МАЛЕНЬКІ БАРАК У ЦЭНТРЫ ВЯЛІКАЙ ПАЛІТЫКІ

Нядаўняе і не вельмі чаканае падарожжа Старшыні Вярхоўнага Савета ў Барысаў мела шырокі рэзананс у друку. «Звязда» таксама падрабязна апісала ваяж С. С. Шушкевіча. Праўда, што-нішто аказалася па-за кадрам. Можна сказаць, дробязі, бытавыя пытанні. Праўда, пры бліжэйшым разглядзе гэтыя дробязі набываюць як бы палітычную афарбоўку...

Я не ставіў на мэце дакладнае адлюстраванне маршруту С. С. Шушкевіча. Проста пабываў па адным з адрасоў і вырашыў праверыць, так сказаць, дзейснасць візіту.

Шукаць доўга не прыйшлося. Дастаткова было трапіць у раён гарадской паліклінікі і спытаць: «А дзе тут той барак?» — і людзі ўсё адразу разумелі і тлумачылі. Пад канец перапытвалі: «А вы што, з газеты?» Здагадлівы ў нас народ, што ні кажы. У адным, праўда, месцы двое мужчын не абмежаваліся расказам, як знайсці барак.

— Дык ці ён адзін такі? Вунь усё навокал валіцца. Ты вось паспрабуй да нашага туалета дабрацца. Ды пасядзець там. Ці во па той лесвіцы на другі паверх зайсці. І мы пісалі, да нас, праўда, Шушкевіч не даехаў. Яно і зразумела, не можа ён даехаць ці дайсці да кожнага барака.

Да туалета я не стаў дабірацца, не было патрэбы. А на лесвіцу палез. Такая, ведаеце, знешняя, з двара адразу на другі паверх. Ужо на трэцяй прыступцы я задумаўся, на пятай — рашуча павярнуў назад. Ну яго да д'ябла, жыццё даражэй.

А навокал — сапраўды хоць фільмы аб пасляваенным цяжкім часе здымай — архітэктура якраз тая. Дзікаватая, прама скажам.

Але рушым да барака па вуліцы Герцэна. Верагодна, ужо і слядоў яго не засталося? А жыльцоў з вялікай урачыстасцю перасялілі ў новыя кватэры? Як бы не так. У вокнах святло, цягне дымком і зусім жылым духам. Людзі ходзяць.

Прызнаюся, у жыцці мне давялося пабачыць шмат жытла, у тым ліку «бомжаўскага» і ўсялякага іншага. Такога — не. Наогул, многія бачылі фота, глядзелі незабыўныя кадры па тэлебачанні.

Агульнымі намаганнямі знаходзім Ірыну Ларыну, яна тады была дома. Яна ды яе маці. Большасць астатніх — на рабоце.

— Якія вынікі? А ніякіх.

— Ну, можа хоць хто да вас прыйшоў, можа куды запрасілі?

— Не. Ніхто ў нас з таго часу не быў. Як толькі паехаў Станіслаў Станіслававіч, дык прыехалі з нейкай газеты, распытвалі, здымалі. Дзяцей, сказалі, распранаць не трэба, няхай так і будуць. А пад вечар і тэлебачанне прыехала. І яны нас здымалі, і калідор гэты страшны.

А калідор, сведчу, проста «выдатны». Летась тут быў пажар. Ад чаго — невядома дагэтуль. Толькі выгляд сцен і некаторых дзвярэй — як пасля налёту «групы захопу».

— Не, Іра, прыходзілі ж! З домакіраўніцтва былі, вось акно забілі фанерай.

Гэта — маці Ірыны Ларынай. Яна таксама на некаторы час стала «тэлезоркай». І засталася ў сваёй кашулі, дзесьці 3×4 метры, з грубкай, зробленай некалі сваімі рукамі. І адрамантаванай «спецыялістамі» роўна на два тыдні (зноў пачала разлазіцца па швах).

«Ударніца» і «стахановка», яна ў свой час спрабавала стаць на сваім заводзе на кватэрны ўлік. Не, сказалі, ваш жа дом пад знос ідзе, хутчэй так атрымаеш. Некалькі дзесяткаў гадоў усё атрымлівае і атрымлівае.

А наведвальнікі ўсё ж былі. Невысокія, праўда. Барак стаў славутым, і народ ходзіць сюды, як у музей. Мясцовым жыхарам гэта ўжо парадкам надакучыла. Але нічога: паказвалі і расказвалі. Паказвалі дзірку ў падлозе, у якую праваліўся Станіслаў Станіслававіч. Ну, а астатнія маляўнічыя падрабязнасці і так відаць.

На жаль, самага галоўнага наведвальніка на дзень майго прыезду так і не дачакаліся. Спадар Трусаў, намеснік старшыні гарвыканкома, часу на гэта не знайшоў. Што ўяўляецца некалькі дзіўным: вось жа ён, гараж трусаўскі, добры такі, белы, салідны. Паглядзіш — і душа радуецца, ну вось жа могуць у нас рабіць! Могуць, калі захочуць. А калі не, то хоць кол на галаве чашы. Так вось і спадар Трусаў не захацеў. Сказаў, будзеце пісаць — згніяце тут. Людзі і гніюць.

У людзей бываюць слабасці, што зробіш. Адзін надта фанабэрысты, другі любіць паспаць. Слабасці трэба разумець. Але да пэўнай мяжы. Скажам, калі звычайны намеснік старшыні райвыканкома нават пасля візіту Старшыні Вярхоўнага Савета рэспублікі, першай асобы дзяржавы, так і не пабываў у гэтым няшчасным бараку, то як гэта назваць? Непавагай? Ці нечым большым — пазіцыяй, напрыклад?

Верагодна, ужо ёсць рашэнне, што размеркаваны кватэры і жыхары барака хутка туды пераедуць. Калі так, то чаму ім пра гэта ніхто не паведаміў? Калі няма рашэння, зноў жа, чаму не сказаць? Вось тут ужо сапраўды пазіцыя. Вельмі нават пэўная: тут гаспадар я. У Вярхоўным Савеце — вы, Станіслаў Станіслававіч, а тут — я, Трусаў. Уласна, і вельмі добра, калі так. Кожны павінен быць гаспадаром на сваім месцы. Нядрэнна было б пры гэтым, праўда, і выконваць свае абавязкі. Кожны свае.

Цікавы штрышок унёс у мае ўражанні адзін барысаўчанін, што падвозіў на сваёй машыне. «Ды што ты — барак, барак, — сказаў, — мне трэба было — я пабудаваў кааператыў. А яны сядзяць у дзярме і пісьмы пішуць. Ну то пішы, дачакаешся ты ад іх...» Яно так, зразумела, але ж хто вінаваты, што людзі такія? На каго даўжок запісаць? «Иных уж нет, а те далече» — і не спытаеш. Наша дабро — нам і разбірацца.

Словам, як ні разважай, а гэты небарака-барак (прабачце за каламбур) апынуўся ў цэнтры вялікай палітыкі. І яшчэ раз ясна стала, што дэмакратычныя імкненні Старшыні Вярхоўнага Савета рэзка разыходзяцца з наменклатурнай практыкай, што... Увогуле, не хочацца займацца чорнымі прагнозамі, але такое ўражанне, што крызіс улады, які мы назіраем, можа скончыцца нечым дрэнным. Магчыма, усеагульнай справядлівасцю. Калі табе — 10 гадоў без права перапіскі і мне таксама.

Сяргей ШАЎЦОЎ.

ДА КАНЦА ПАДПІСКІ ЗАСТАЛОСЯ 8 ДЗЕН. ІНДЭКС «ЗВЯЗДЫ» — 63850, ПАДПІСНАЯ ЦАНА НА ПАЎГОДА — 120 РУБЛЁЎ.

ВАША ЗДАРОЎЕ

Зялёная гарбата

Зялёная гарбата — моцнадзейны ўзбуджальны сродак. Яго стымулюючыя ўласцівасці абумоўлены галоўным чынам кафеінам. Колер і аскомісты смак настою надаюць таніны, духмянасць — эфірныя алеі. Танін папулярнай у Сярэдняй Азіі зялёнай гарбаты складаецца з рэчываў, якія валодаюць процісклерозным дзеяннем. Яны спрыяльныя для слізістай страўнікавага тракта, добра дзейнічаюць на кішэчную мікрафлору, зніжаючы інтэнсіўнасць гніласных працэсаў. Апрача таго, зялёная гарбата валодае антымікробным дзеяннем і таму эфектыўная, напрыклад, пры лячэнні дызентэрыі.

Для гэтых мэт трэба ўмець правільна прыгатаваць адвар. Вазьміце сто грамаў сухой зялёнай гарбаты, заліце двума літрамі вады і настойвайце на працягу паўгадзіны. Пасля на працягу гадзіны, час ад часу памешваючы, кіпяціце і затым адфільтруйце вадкасць праз двайны слой марлі. Заварку, што засталася, зноў заліце літрам вады, пракіпяціце на працягу сарака хвілін і таксама адфільтруйце. Цяпер змяшайце атрыманую вадкасць, разліце ў бутэлькі і пастэрызуйце.

Прымаць адвар трэба па дзве сталовыя лыжкі чатыры разы на дзень за паўгадзіны да яды на працягу дзесяці дзён. Адвар зялёнай гарбаты рэкамендуюць яшчэ і тым, хто пакутуе калітамі і энтэракалітамі. Зялёную гарбату нельга ўжываць пры бяссонніцы, гіпертанічным захворванні, а таксама захворваннях сардэчна-сасудзістай сістэмы.

Агароднiна-лякарства

Буракі чым цямнейшыя, тым больш карысныя. Колер іх залежыць ад утрымання анатацыяну, які трапляе ў страву, а ў нас змяншае колькасць халестэрыну. Акрамя таго, самыя звычайныя сталовыя буракі ўтрымліваюць да 10 працэнтаў лёгказасвяальных цукроў, поўны набор вітамінаў, арганічныя кіслоты, мінеральныя солі калію, фосфару, кальцыю, магнію, жалеза і ёду. Што імі толькі не лячылі нашы продкі — малакроўе, нервы, сон, гіпертанію, цынгу, бронхіт, запоры, туберкулёз, насмарк, бародаўкі, апёкі, раны і язвы. У буракоў ёсць і тая вялікая перавага, што пры правільным захоўванні яны амаль не губляюць сваіх якасцей да новага ўраджаю.

На жаль, гаючы бурачны сок на смак, прама скажам, так сабе. Нават дабаўленне мёду не вельмі дапамагае. Піць яго даводзіцца як лякарства.

Вялікай колькасцю бурачнага соку можна і атруціцца (добра, калі проста «пранясе»). На ўсякі выпадак, калі вы ніколі не лячыліся сокамі, пачынайце з трэці шклянкі на адзін прыём. Наступны вузкі момант сокалячэння — утрыманне ў агародніне нітратаў і нітрытаў, ад якіх не страхуе нават пакупка на рынку.

Ад насмарку сок буракоў закапваюць у нос, ад перхаці — уціраюць у скуру галавы, а пры скурных захворваннях прыкладваюць кашку (буракі труць на дробнай тарцы). Ад малакроўя п'юць сок, змяшаны з мёдам ці трайную сумесь (буракі-морква-рэдзька) па 1—2 ст. лыжкі за 10—15 хвілін да яды на працягу 1—2 месяцаў. Для лячэння і прафілактыкі гіпертаніі п'юць 1/4—1/3 шклянкі соку 4 разы на дзень пасля яды. Хто вытрымлівае, можна і больш, да шклянкі. Паляпшэнне пачынаецца дзён праз пяць. Для заспакаення нерваў і добрага сну дозы крыху меншыя.

Гіпертонікам і тым, хто схільны да запораў, вельмі карысна з'ядаць кожны дзень па 100 г вараных буракоў для прафілактыкі. Каб страты вітамінаў пры варцы былі мінімальныя, буракі ў маленькай каструльцы заліце кіпенем і варыце пад крыху прыадкрытай накрыўкай на сярэднім агні, без яўнага кіпення. Чым менш часу яны будуць варыцца, тым больш застанецца вітамінаў. Як для лячэння, так і для яды буракі лепш выбіраць сярэдняга памеру ці крыху меншыя.

Яшчэ больш просты спосаб лячыцца — часцей гатаваць што-небудзь з буракоў. Для жадаючых пахудзець буракі на нейкі час павінны стаць амаль асноўнай агароднінай. Каб менш хацелася есці, жуйце больш павольна і ўдумліва, чым карова. А думайце пра штонебудзь прыемнае.

Ледзь не забыліся: вада з-пад буракоў таксама можа спатрэбіцца. Калі пры запорах вараных буракоў аказалася недастаткова, паставіце клізму з іх адвару.

Фізкультурная паўза

Чытачы, якія большую частку рабочага часу праводзяць за пішучай машынкай, просяць парэкамендаваць ім комплекс практыкаванняў, якія дапамагаюць зняць стомленасць.

Большасць мышцаў у чалавека такой працы маюць пастаянную статычную нагрузку. Стамляюцца паясніца, спіна, плечы, шыя, парушаецца кровазварот, зніжаецца працаздольнасць.

Каб зняць стомленасць, неабходныя дзве-тры фізкультурныя паўзы. Кожнае практыкаванне трэба выконваць 8—10 разоў, правільна, дакладна, з найбольшай амплітудай рухаў.

1. Седзячы на крэсле. Паставіце ногі на шырыню плячэй, расслабленыя рукі пакладзіце на калені. Падыміце прамыя рукі праз бакі ўверх, прагніцеся, паглядзіце ўверх, зрабіце глыбокі ўдых. Апусціце рукі на калені — выдых.

2. Седзячы на крэсле, рукі на каленях. Павольныя кругавыя рухі галавой налева, затым направа. Нахіляючы галаву назад, рабіце ўдых, нахіляючы ўперад — выдых.

3. Седзячы на крэсле, рукі на каленях. Падыміце прамыя рукі ў бакі і зрабіце імі тры-чатыры пружыністыя рухі назад так, каб злучаліся лапаткі, — удых. Апусціце рукі на калені — выдых.

4. Сагніце рукі ў локцях пад прамым вуглом, пальцы развядзіце. Паслядоўна, пачынаючы з мезенца, веерападобным рухам сагніце пальцы ў кулак. Затым, пачынаючы з вялікага пальца, разагніце. Пасля гэтага зрабіце практыкаванне, згінаючы першым вялікі палец. Закончыўшы практыкаванне, падыміце рукі ўверх, патрасіце расслабленымі кісцямі і зрабіце масаж, пагладжваючы руку ад кончыкаў пальцаў, па прадплеччы да локцевага сустава.

5. Стоячы, ногі на шырыні плячэй. Падымайце і апускайце плечы. Падымаючы плечы, рабіце ўдых, апускаючы—выдых. Затым зрабіце кругавыя рухі плячамі наперад і назад.



6. Паставіце ногі на шырыню плячэй, рукі падыміце ўверх або за галаву. Рабіце кругавыя рухі тулава ў левы, затым у правы бакі. У момант прагінання — удых, у час нахілу наперад — выдых.

7. Ногі на шырыні плячэй, рукі на поясе. Рабіце кругавыя рухі тазам у левы, затым у правы бок. Дыханне раўнамернае.

8. Ногі шырэй плячэй, рукі на поясе. Нахіліцеся наперад, пальцамі левай рукі дакраніцеся да наска правай нагі — выдых. Вярніцеся ў зыходнае становішча — удых. Затым, нахіляючыся наперад, дакраніцеся пальцамі правай рукі да наска левай нагі. Ногі не згінайце.

9. Станьце спінай да стала на адлегласці паўкрока, ногі на шырыні плячэй, рукі — на стале. Цвёрда стоячы на месцы, павярніце тулава налева так, каб вы аказаліся тварам да стала, і пакладзіце рукі на яго край — выдых. Вярніцеся ў зыходнае становішча — удых. Зрабіце практыкаванне, павярнуўшы тулава ўправа.

10. Станьце на дыбачкі, падыміце рукі праз бакі ўверх і зрабіце глыбокі ўдых. Прысядзьце на пальчыкі, апусціце рукі праз бакі ўніз і падыміце наперад — выдых.

Закончыць практыкаванні можна хадзьбой на месцы.

(Па матэрыялах часопіса «Наука и жизнь».)

Заява Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

АБ НЕАБХОДНАСЦІ ПАСКАРЭННЯ КАНСТЫТУЦЫЙНЫХ ПЕРАЎТВАРЭННЯЎ У РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

ідэі і прынцыпаў прававой дзяржавы. Аднак пабудова прававой дзяржавы немагчыма без дакладнага выканання законаў, а дэмакратычныя пераўтварэнні павінны адбывацца ў строгай адпаведнасці з Канстытуцыяй і законамі Рэспублікі Беларусь.

Ініцыятары правядзення рэспубліканскага рэферэндуму дапусцілі грубыя парушэнні артыкулаў 11 і 13 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб народным галасаванні (рэферэндуме) у Рэспубліцы Беларусь». Цэнтральная камісія па рэферэндуму Рэспублікі Беларусь таксама парушыла патрабаванні Закона, зарэгістраваўшы пытанне ў фармулёўцы, якая не адпавядае дзеючай Канстытуцыі (Асноўнаму Закону) Рэспублікі Беларусь, і не даўшы належнай ацэнкі парушэнням заканадаўства аб рэферэндуме.

Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь на падставе артыкула 14 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб народным галасаванні (рэферэндуме) у Рэспубліцы Беларусь» адхіліў прапанову аб правядзенні рэспубліканскага рэферэндуму.

Разам з тым Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь, улічваючы палітычную сітуацыю ў рэспубліцы, лічыць неабходным засяродзіць сваю ўвагу на паскарэнні канстытуцыйных пераўтварэнняў у Рэспубліцы Беларусь і прыняцці новых выбарчых законаў на альтэрнатыўнай аснове. Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь бачыць сваёй галоўнай задачай прыняцце не пазней 1993 года Канстытуцыі (Асноўнага Закона) Рэспублікі Беларусь і правядзенне ў сакавіку 1994 года выбараў у новы вышэйшы орган дзяржаўнай улады Рэспублікі Беларусь.

Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь заяўляе, што ўсе канстытуцыйныя пераўтварэнні ў рэспубліцы павінны будавацца на сапраўды дэмакратычных пачатках з прыцягненнем да заканатворчага працэсу грамадзян Рэспублікі Беларусь, прадстаўнікоў палітычных партый, грамадскіх аб'яднанняў і працоўных калектываў.

Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь.

Пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь

АБ АДКАЗНАСЦІ ЗА НЕЗАКОННАЕ РАСХОДАВАННЕ БЮДЖЭТНЫХ СРОДКАЎ, НЕДАСТАЧУ І РАСКРАДАННЕ ДЗЯРЖАЎНАЙ МАЁМАСЦІ

У мэтах узмацнення адказнасці за расходванне бюджэтных сродкаў і захаванасць дзяржаўнай маёмасці Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь **пастанаўляе:**

1. Пры выкліканым прыпіскамі, прымяненнем няправільных расцэнак, павышаючых каэфіцыентаў і іншымі прычынамі завышэнні аб'ёмаў і кошту будаўніча-мантажных і рамонтна-будаўнічых работ, выкананых за кошт бюджэтных асігнаванняў, з падрадчыка спаганяецца ў адпаведны бюджэт сума завышэння. Адначасова ў яго з падрадчыка і заказчыка ў роўных долях спаганяецца штраф у размеры завышанай сумы.

2. Суб'екты гаспадарання, незалежна ад форм уласнасці і падпарадкаванасці, якія незаконна атрымалі дзяржаўныя сродкі, а таксама выкарысталі не па прызначэнню сродкі, вылучаныя на пэўныя мэты, у тым ліку на ліквідацыю вынікаў аварыі на Чарнобыльскай АЭС, вяртаюць іх у поўным аб'ёме ў адпаведны бюджэт і ўплачваюць у яго штраф у такім жа памеры.

3. Пры недастачы, раскраданні, наўмысным знішчэнні або псаванні тавара-матэрыяльных каштоўнасцей і іншай дзяржаўнай маёмасці ўрон кампенсуецца зыходзячы з цэн, якія склаліся на дзень яго выяўлення, а тавара-матэрыяльных каштоўнасцей, на якія ўстанаўліваюцца рэгулюемыя цэны, ён вызначаецца зыходзячы з цэн, павялічаных на суму датацыі.

4. У выпадку выяўлення недастачы або крадзяжу тавара-матэрыяльных каштоўнасцей, што паступілі дзяржаўным прадпрыемствам, арганізацыям, установам, грамадскім аб'яднанням (арганізацыям) у парадку гуманітарнай дапамогі (безвыплатна), з вінаватых асоб спаганяецца ў бюджэт іх кошт, што вызначаецца ацэначнай камісіяй з удзелам прадстаўнікоў мясцовых фінансавых органаў па дзеючых рыначных цэнах.

5. Спагнанне ў бюджэт указаных у пунктах 1, 2 і 4 сродкаў праводзіцца адпаведнымі фінансавымі органамі па матэрыялах рэвізій і праверак згодна з дзеючым заканадаўствам.

Міністэрству фінансаў у месячны тэрмін устанавіць парадак залічэння на бюджэтныя рахункі сродкаў, якія будуць паступаць у выніку спагнання штрафаў і кошту раскрадзеных матэрыяльных каштоўнасцей.

6. Прымяненне да прадпрыемстваў, арганізацый і ўстаноў эканамічных санкцый не вызваляе кіраўнікоў і іншых службовых асоб ад адказнасці, устаноўленай заканадаўствам за ўказаныя ў гэтай пастанове парушэнні.

7. Міністэрству юстыцыі, Міністэрству фінансаў, Дзяржэканомплану пры падрыхтоўцы заканадаўчых актаў прадугледжваць меры эканамічнай адказнасці за незаконнае і нямэтавае выкарыстанне бюджэтных сродкаў і захаванасць дзяржаўнай маёмасці.

Старшыня Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь
В. КЕБІЧ.

Намеснік кіраўніка справаў Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь
В. ДЗЕБЛІКАЎ.

30 кастрычніка 1992 г.
г. Мінск.

ПОСТФАКТУМ

Апазіцыя заявіла, што Вярхоўны Савет страціў легітымнасць

Учора пасля тыднёвага маўчання апазіцыя БНФ у Вярхоўным Савеце выказала адносіны да рэакцыі парламента на праблему рэферэндуму

Існуюць розныя меркаванні наконт таго, чаму апазіцыя са значным спазненнем прарэагавала на рашэнне Вярхоўнага Савета не праводзіць усенароднае галасаванне. На нашу думку, сярод прыхільнікаў БНФ не было згоды наконт таго, якім чынам адказаць на такое адназначнае і катэгарычнае адмаўленне рэферэндуму. Задоўга да 29 кастрычніка ў кулуарах Вярхоўнага Савета можна было пачуць меркаванне, што апазіцыя ў выпадку, калі парламенцкая большасць праігнаруе іх патрабаванне, можа ўвогуле пакінуць Вярхоўны Савет, не ўдзельнічаць у галасаванні.

Аднак у выніку дыскусій БНФ прыняў больш памяркоўнае рашэнне. Праўда, дэпутаты ад Народнага фронту пакінулі за сабой права «не прымаць удзел у галасаванні», аднак адначасова з гэтым заявілі, што «застаючыся ў жорсткай парламенцкай апазіцыі», яны будуць «змагацца за адпаўленне законнасці, за інтарэсы выбаршчыкаў». Акрамя таго, дэпутаты ад апазіцыі паабяцалі, што «будуць дамагацца адмены антызаконнага рашэння Вярхоўнага Савета ўсімі даступнымі канстытуцыйнымі сродкамі».

Заяву апазіцыі падпісаў 31 дэпутат. Гэта значна менш за тую колькасць, якую збіраў БНФ пад свае сцягі ў лепшыя для сябе часы. Факт лішні раз пацвярджае, што ў лагеры апазіцыі няма адзінства. У апошнія месяцы яна пацярпела значныя страты. Прычын гэтага нямала, прытым як аб'ектыўнага, так і суб'ектыўнага характару. Можна меркаваць, што і ў далейшым парламенцкая апазіцыя будзе выпрабоўвацца на ідэйную ўстойлівасць і прынцыповасць заманлівымі прапановамі і перспектывамі, якія дае блізкасць да ўлады.

Памяркоўнасць заявы, прынятай апазіцыяй, абумоўлена і шэрагам іншых фактараў. Сацыяльных узрушэнняў адмова ад рэферэндуму не выклікала. Грамадская думка ўспрыняла гэту падзею будзённа і абыякава. Рэзкага выступлення «антыканстытуцыйных сіл», аб якім перасцерагаў БНФ, не назіралася.

На нашу думку, ёсць і іншыя прычыны стрыманасці. Ацэнка рашэння, прынятага Вярхоўным Саветам па рэферэндуму, не можа быць адназначнай. Каму яно прыносіць большую карысць у перспектыве — гэта яшчэ пытанне. Па вялікаму рахунку, адмова правесці рэферэндум — нават на карысць Народнаму фронту. Усенароднае галасаванне па фармулёўцы, на якой настойвала ініцыятыўная група, у любым выпадку не магло адбыцца сёлетняй восенню. Між тым несумненна, што паўтара года, якія засталіся да выбараў, будуць найскладанейшымі для эканомікі краіны. Выйсця з крызісу пакуль што не бачна. Наадварот, яго вір усё глыбей зацягвае Беларусь. У такіх умовах утрымацца на паверхні нават самым дэмакратычным парламенту і ўраду было б надзвычай цяжка. Гэтыя паўтара года Народнаму фронту выгадна заставацца ў апазіцыі. Эканамічныя цяжкасці самі па сабе будуць набіраць яму ачкі.

Ці выкліча заява апазіцыі з яе даволі жорсткімі фармулёўкамі аб «нелегітымнасці Вярхоўнага Савета» і «ўтрыманнем ім улады незаконнымі сродкамі» — колькі-небудзь значную рэакцыю ў грамадстве? Хутчэй за ўсё — не. Прынамсі, гэта рэакцыя будзе не большай, чым 29 кастрычніка, пасля рашэння ВС не праводзіць рэферэндуму. Пераважную большасць нашых суграмадзян хвалююць іншыя праблемы. Адметны факт: сярод соцень настаўнікаў Мінска — інтэлектуальнай эліты грамадства,—што выйшлі гэтымі днямі на плошчу Незалежнасці і паралізавалі рух грамадскага транспарту, не было ніводнага лозунгу з патрабаваннем рэферэндуму. Затое больш чым дастаткова скаргаў на нізкую зарплату. Даводзіцца канстатаваць: палітыка ўсё больш адступае для большасці грамадства на другі план перад рэальнай пагрозай эканамічнага краху.

Валянцін ЖДАНКО.

Штаны як калектыўная ўласнасць

Цытую па «Комсомольской правде» паведамленне ІТАР—ТАСС: «Зямля ў Расійскай Федэрацыі можа знаходзіцца ў прыватнай і дзяржаўнай уласнасці — гаворыць адзін з ключавых артыкулаў праекта Асноў заямельнага заканадаўства, прынятага 3 лістапада, у першым чытанні Саветам Нацыянальнасцей. Другая палата Вярхоўнага Савета — Савет Рэспублікі — прыняла яго напярэдадні. Цяпер законапраект будзе дапрацаваны ў камітэтах і камісіях. А потым вынесены на канчатковае зацвярджэнне парламента».

Такім чынам, Расія, здаецца, вызначылася ў самым, бадай, важным пытанні рэформы. З вялікай доляй упэўненасці можна гаварыць аб тым, што расійскі парламент калектыўнай уласнасці на зямлю не прызнае.

Парадуемся за суседзяў. А ў нас такія песні: і на Украіне, і ў Расіі калектыўная ўласнасць існуе. Дазвольце, Расія з гэтага кароценькага спіса ўжо выпала. А старшыня камісіі ВС па аграрных пытаннях У. Г. Гаркун яшчэ ў суботу, на сустрэчы С. С. Шушкевіча з фермерамі, актыўна на суседзяў спасылаўся: маўляў, яны за нас не дурнейшыя.

Наогул, такое меркаванне выглядае не зусім карэктным: калі ўсе пойдуць вешацца, то, што, і мне ісці? Тым больш, прабачце, ужо не ўсе «вешаюцца» — Расію гэтая перспектыва не спакушае. Выходзіць, адзін з галоўных козыраў з рук нашых прапіўнікаў прыватнай уласнасці на зямлю — выбіты. Хоць гэта яшчэ нічога не азначае. Мы шмат разоў пераконваліся, што так званая «пераважная большасць» Вярхоўнага Савета вельмі паспяхова можа ісці насуперак разумнаму сэнсу. А ён у даным выпадку такі: зямлёй могуць валодаць толькі два суб'екты — дзяржава ці ўласна чалавек. А як гэта — калектыўна? А прыкладна так, калі вашымі штанамі ў роўнай меры валодаеце вы і ваш сусед. Цікава, дэпутаты, што за калектыўную ўласнасць, з гэтым бы пагадзіліся?

Я ні ў якім разе не стаўлю мэтай паўплываць на меркаванні народных дэпутатаў. Адзінае, што хвалюе: разумны сэнс.

Сяргей ШАЎЦОЎ.

БЕНЗІН: СПЫНІСЯ, ІМГНЕННЕ

Як «Звязда» паведамляла ўжо, з 31 кастрычніка кошт бензіну ў Беларусі «падскочыў» уверх. Дзіўна, але на ўладальнікаў аўтамабіляў новы цэнавы «выбрык» вялікага ўражання не зрабіў: яго чакалі. Самыя прадбачлівыя паспелі адхапіць па некалькі каністраў гаручага па старых цэнах — 15 рублёў і 17 рублёў 50 капеек. Чэргі ж, якія віліся ля аўтазаправак, трэба сказаць, крыху зменшыліся, аднак і зараз «хвасты» дасягаюць даволі значных памераў.

Адзін факт заклапочвае: нават па новых цэнах бензін не на ўсіх аўтазапраўках знойдзеш. Калі на аўтазапраўцы, што на Маскоўскай шашы, А-76 і А-93 ёсць у наяўнасці, дык у Зялёным Лузе ні семдзесят шостага, ні дзевяноста трэцяга няма. Насычэнне беларускага рынку нафтапрадуктамі з Расіі, на жаль, вымушае жадаць лепшага. Як растлумачылі нам у Дзяржкамнафтапрадукце, нафтаперапрацоўчыя заводы ў Мазыры і Наваполацку пакутуюць ад хранічных недаставак сыравіны з Расіі, хаця за тону нафты мы плацім 14, 16, 18, 32 тысячы рублёў (у залежнасці ад не якасці).

— А-76 зараз каштуе 30 рублёў, А-93—35, гаворыць намеснік начальніка эканамічна-планавага аддзела Дзяржкамнафтапрадукта Людміла Радкевіч. — Цэны гэтыя да новага года зафіксаваны пастановай № 657 Саўміна і наўрад ці зменяцца.

Як бачым, па словах аднаго са спецыялістаў Дзяржкамнафтапрадукта, аўтаматарам можна ў 1992 годзе ўжо не хваляваць: непрадбачаных расходаў быццам бы не чакаецца. Толькі на думку намесніка начальніка Упраўлення рэсурсаў, балансаў, аптовага гандлю і паставак нафтапрадуктаў Дзяржкамнафтапрадукта Міхаіла Пахомава, ніякіх прагнозаў наконт цэнаў на бензін рабіць не трэба. Хто ведае, якія ўказы могуць яшчэ з'явіцца з-пад пяра Ельцына аб нафтапрадуктах?

Ігар ШЧУЧЭНКА.

interfax ІНТЕРФАКС

У ЗОНЕ КАНФЛІКТУ ПАМІЖ АСЕЦІНАМІ І ІНГУШАМІ ВОЙСКІ І МІЛІЦЫЯ ЗАНЯЛІ ДВА ІНГУШСКІЯ СЯЛЫ

Абстаноўка ў зоне асеціна-інгушскага канфлікту ў Прыгарадным раёне Паўночнай Асеціі ў мінулыя суткі заставалася напружанай, паведамляе Цэнтр грамадскіх сувязей МУС Расіі.

Паводле даных ЦГС, вайсковыя падраздзяленні сумесна з міліцыяй і атрадамі асецінскага апалчэння занялі 4 лістапада сяло Куртат і пасёлак Дачнае. Пад кантролем інгушоў застаюцца сёлы Майскае, Тарское, а таксама паўночна-ўсходняя частка сяла Чермен.

Паводле папярэдніх даных, за час канфлікту з асецінскага боку загінула 97 чалавек, ранены 253, у тым ліку 9 супрацоўнікаў міліцыі. З інгушскага боку, паводле даных са сталіцы Інгушэціі Назрані, загінула 49 і ранена 252 чалавекі.

УКАЗ ПРЭЗІДЭНТА РФ АБ АДСТАЎЦЫ СТАРАВОЙТАВАЙ З'ЯВІЎСЯ ДЛЯ ЯЕ «ПОЎНАЙ НЕЧАКАНАСЦЮ»

Галіна Старавойтава, вызваленая 4 лістапада ўказам прэзідэнта Расіі Барыса Ельцына ад пасады саветніка кіраўніка дзяржавы па пытаннях міжнародных адносін, заявіла ў сераду ў інтэрв'ю «Інтэрфаксу», што ўказ для яе з'явіўся поўнай нечаканасцю. Па яе словах, дакумент быў дастаўлены да яе ў кабінет увечары 4 лістапада ў той момант, калі Г. Старавойтава «дапісвала чарговую службовую запіску прэзідэнту са сваім аналізам і прапановамі па падзеях на Паўночным Каўказе».

Экс-саветнік прэзідэнта адзначыла таксама, што на працягу некалькіх тыдняў «стаіць у чарзе на прыём да прэзідэнта для гутаркі па складаных і набалелых пытаннях у галіне нацыянальных адносін у Расійскай Федэрацыі».

Г. Старавойтава адзначыла, што ніякіх просьбаў аб адстаўцы з яе боку не было.

ПРЭЗІДЭНТ НАЗАРБАЕЎ НЕ ЛІЧЫЦЬ РАХМОНА НАБІЕВА КІРАЎНІКОМ ТАДЖЫКІСТАНА

Прэзідэнт Казахстана Нурсултан Назарбаеў лічыць неабгрунтаванай заяву Рахмона Набіева аб тым, што той з'яўляецца кіраўніком Таджыкістана

Н. Назарбаеў параіў журналістам пагутарыць на гэту тэму з выконваючым абавязкі прэзідэнта Таджыкістана Акбаршо Іскандэравым, якога назваў прадстаўніком «законнай» улады.

ГРОЗНЫ ПАПЯРЭДЖВАЕ МАСКВУ АБ НЕБЯСПЕЦЫ СПРОБ РАСПАЎСЮДЗІЦЬ ДЗЕЯННЕ НАДЗВЫЧАЙНАГА СТАНОВІШЧА НА ДВА РАЁНЫ ЧЭЧНІ

Парламент Чэчні папярэдзіў, што ў выпадку, калі Масква паспрабуе распаўсюдзіць рэжым надзвычайнага становішча на тэрыторыі Сунжэнскага і Малгабекскага раёнаў, якія з'яўляюцца неад'емнай часткай Чэчэнскай Рэспублікі, гэта ў адпаведнасці з нормамі міжнароднага права будзе разглядацца як «узброеная агрэсія супраць незалежнай чэчэнскай дзяржавы». «Уся адказнасць за вынікі падобнага кроку цалкам ляжа на кіраўніцтва Расійскай Федэрацыі», — гаворыцца ў прынятай у чацвер парламентам заяве.

І АЎТОБУС СТАНОВІЦЦА РАСКОШАЙ

МІНСК. (А. Рамановіч). Як паведаміў начальнік «Мінскпасажыраўтатранса» В. Чалоўскі, сёння літр А1-76 каштуе 30 рублёў. Кошт аднаго літра дызельнага паліва вырас да 28 рублёў.

— Штосутачна наша аб'яднанне выкладае на паліва 6,5 мільёна рублёў, — працягвае В. Чалоўскі, — а гэта вельмі і вельмі многа пры нашых абмежаваных магчымасцях. Мы можам проста не вытрымаць гэтага марафону і спыніцца.

А каб гэтага не адбылося, калектыў аб'яднання звярнуўся да міністра аўтатранспарту Рэспублікі Беларусь В. Бародзіча з просьбай павялічыць аплату за праезд на міжгародніх маршрутах у 1,5 раза. Відаць, рэакцыі зверху доўга чакаць не прыйдзецца. Знізу, ад пасажыраў — таксама.

АРЫЕНЦІР — ЛЯМПАЧКА ІЛЬІЧА?

Паліва ў Беларусі хутка стане на вагу золата, — заключылі нядаўна прадстаўнікі Мазырскага нафтаперапрацоўчага завода. І яны, відаць, маюць рацыю, таму што Мазырскі НПЗ вымушаны быў з 30 кастрычніка спыніцца з-за таго, што Расія перастала падаваць нафту. Праўда, кіраўніцтва расійскіх свідравін і далей давала б нам «чорнае золата», калі б было чым з імі разлічвацца. Прадпрыемства ўжо з мінулага года пачало ліхаманіць і трэсці ў сувязі з рознымі павелічэннямі цэн на нафту. І па сённяшні дзень яно «націралася» сабе 5,5 мільярда рублёў доўгу. Дарэчы, другі і апошні ў рэспубліцы нафтаперапрацоўчы завод— Наваполацкі — залез у даўгі яшчэ больш. На яго разліковым рахунку аж мінус 12 мільярдаў. І ён таксама дыхае на ладан...

Усё ішло больш-менш нармальна, пакуль прэзідэнт Расійскай Федэрацыі Барыс Ельцын 18 верасня 1992 года не выдаў Указ, у адпаведнасці з якім былі падняты цэны на нафту. Нафтаперапрацоўчыя аб'яднанні Расіі таксама з 18 верасня паднялі ўзровень аплаты за нафту ад 11 да 15 тысяч рублёў за адну тону (ранейшая цана— 2,8 тысячы рублёў). Рашэнне аб павышэнні цаны ў нашай рэспубліцы было прынята значна пазней: спачатку 9 кастрычніка — да 7,5 тысячы рублёў за тону, і ў рэшце рэшт 30 кастрычніка — да 13 тысяч рублёў. Гэты ўзровень цэн зафіксаваны пастановай Савета Міністраў нашай рэспублікі.

Парадаксальная атрымліваецца сітуацыя: нафта з Расіі ў Беларусь цякла па трубах па адных цэнах, а разлікі дзяржавы за яе з Мазырскім і, відаць, Наваполацкім НПЗ, вяліся на іншых, значна ніжэйшых. У выніку Мазырскае нафтаперапрацоўчае прадпрыемства на мяжы банкрутства.

Такая сітуацыя прывяла да таго, што 12 тысяч заводчан ужо фактычна не могуць утрымліваць свае сем'і. Акрамя таго, велізарны прамысловы вузел горада звязаны з заводам, і дабрабыт яшчэ 25—30 тысяч гараджан залежыць ад таго, як ён працуе.

Кіраўніцтва завода ўжо неаднаразова звярталася да ўрада рэспублікі, але пакуль безвынікова. Калі ў далейшым сітуацыя не прасяніцца, — лічыць дырэктар завода Уладзімір Здабноў, то нафтаперапрацоўчаму прадпрыемству і звязанаму з ім сыравінным пастаўкамі заводу кармавых дражджэй пагражае фінансавы крах і самаліквідацыя, што імгненна адаб'ецца на эканоміцы рэспублікі не самым лепшым чынам.

Ці можна разарваць гэтае кола праблем? Так. Але толькі тады, калі ўрад пакрые заводу страты на набыццё нафты па павышаных цэнах і дазволіць Мазырскаму і Наваполацкаму НПЗ набываць нафту, запланаваную для рэалізацыі па свабодных цэнах звыш устаноўленай квоты, і таксама па такіх жа цэнах прадаваць нафтапрадукты спажыўцам.

А пакуль, па прагнозах мазырскіх нафтавікоў, нас можа чакаць халодная і, магчыма, галодная зіма, калі не будзе хапаць бензіну нават машынам «хуткай дапамогі» і тым, што развозяць па крамах хлеб, а на цеплаэлектрастанцыях не стане мазуту, дзякуючы якому ў нашых дамах цёпла і гарыць святло.

Тады прыйдзецца абмежавацца толькі адной лямпачкай Ільіча, усяго на 40 Вт. На астатнія не хопіць магутнасці.

Уладзімір ЗДАНОВІЧ.

РАДЫЁ ПЕРАХВАТ

РАДЫЁ «СВАБОДА»

* Як лічаць назіральнікі, на з'ездзе Саветаў Расіі, які павінен пачаць сваю работу 1 снежня, кансерватары дадуць бой Ельцыну.

* Прэзідэнт Чэчні Д. Дудаеў вылучыў свой план урэгулявання канфлікту ў Асеціі. Згодна з ім, з зоны канфлікту павінны быць выведзены ўсе ўзброеныя атрады, у тым ліку і сілы Расіі. А ваенныя фарміраванні Канфедэрацыі горскіх народаў могуць узяць на сябе ролю буфера паміж варагуючымі бакамі. Тым часам кіраўніцтва Чэчні мяркуе аб'явіць мабілізацыю і правесці ваенныя вучэнні, каб пераканацца ў абараназдольнасці рэспублікі.

* Нестабільная абстаноўка ў былых савецкіх рэспубліках будзе і надалей знаходзіцца ў цэнтры ўвагі прэзідэнтаў ЗША. Аб гэтым заявіў амерыканскі міністр абароны Чэйні на міжнароднай канферэнцыі інвестараў. Ён выказаў меркаванне, што, нягледзячы на тое што небяспека глабальнай ядзернай катастрофы мінула, ЗША ўсё ж будуць кантраляваць ядзерныя арсеналы краін СНД, якія яшчэ павінны стварыць стабільныя эканамічныя і палітычныя структуры.

* Украіна і прыбалтыйскія краіны заявілі, што не могуць плаціць узносы ў ААН, якія яны лічаць несправядлівымі і вельмі высокімі. Магчыма, Беларусь і некаторыя іншыя краіны СНД далучацца да гэтай заявы.

* Адмірал Касатонаў заявіў, што ваенныя маракі эвакуіравалі з Грузіі і Абхазіі 35 тысяч бежанцаў. Асабліва цяжка вывозіць людзей з Сухумі. Касатонаў сказаў, што да 31 снежня г. г. ваенна-марская база з Поці будзе пераведзена ў Наварасійск. Ён таксама паведаміў, што прысягу на вернасць Украіне прынялі ўсяго 2 працэнты чарнаморцаў.

«БІ-БІ-СІ»

* Брытанскі парламент вырашыў працягваць працэдуру, якая прывядзе ў выніку да ратыфікацыі Маастрыхтскага дагавора па стварэнню Еўрапейскага саюза. Але гэта рашэнне ў палаце абшчын было прынята з перавагай усяго ў тры галасы. Прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі Мэйджар сутыкаецца з вялікай апазіцыяй па гэтым пытанні. Супраць Маастрыхтскага пагаднення выступаюць у парламенце нават кансерватары. Апазіцыйная лейбарыстская партыя галасавала супраць ратыфікацыі гэтага дагавора.

* Прадстаўнік ЕС заявіў у Жэневе, што калі ЗША прыймуць санкцыі супраць экспарту еўрапейскіх сельскагаспадарчых тавараў, то Еўропа прыме меры ў адказ.

«ГОЛАС АМЕРЫКІ»

* Амерыканка польскага паходжання Барбара Мікульска прайшла на другі тэрмін у сенат ЗША. А Кэрол Броўн з Чыкага стала першай чарнаскурай амерыканкай, якая была выбрана ў сенат.

* Пасол ЗША ў Маскве Р. Страус заявіў, што яму з вялікай цяжкасцю ўдалося пераканаць расійскае кіраўніцтва ў тым, што са зменай адміністрацыі знешняя палітыка Вашынгтона застанецца ранейшай. Р. Страус таксама адзначыў, што ў апошнія дні лідэры Расіі шмат пыталіся ў яго, што за асоба Клінтан, якой пазіцыі ён прытрымліваецца.

«НЯМЕЦКАЯ ХВАЛЯ»

* Лідэры трох прыбалтыйскіх краін сустрэліся ў Вільнюсе, каб абмеркаваць эканамічную і палітычную сітуацыю, якая склалася ў сувязі з адмовай Расіі вывесці свае ўзброеныя сілы. Будзе выпрацаваны агульны стратэгічны курс па гэтай праблеме.

* У Боне пачаліся перагаворы прэм'ер-міністра Польшчы Х. Сухоцкай з кіраўнікамі ФРГ. Галоўнае пытанне — уваходжанне Польшчы ў ЕС.

● РАДЫЁПЕРАХВАТ ● РАДЫЁПЕРАХВАТ ● РАДЫЁПЕРАХВАТ

ВОЗГАДАЕ РОЗГАДАЕ

НА ГАЛОДНЫМ ПАЙКУ

Сур'ёзная праблема з прыродным газам узнікла ў Пінску. Зацягнуты рамонт цеплавых сетак яшчэ больш абвастрыў сітуацыю, бо жыхары шматкватэрных дамоў пастаянна ўключалі газавыя гарэлкі на кухні. Адказныя работнікі Пінскміжрайгаза выехалі ў Расію здабываць звадкаваны газ. Але нават калі іх ваяж ўдасца і ў горад прыбудзе некалькі дадатковых цыстэрнаў з газам, то яго ўсё роўна хопіць ненадоўга. У адзіночку праблему з газазабеспячэннем Пінску не вырашыць. Патрэбны пагадненні з пастаўшчыкамі энерганосьбітаў на больш высокім, магчыма, урадавым узроўні.

ХЛЕБ УСЯМУ ГАЛАВА

ГОМЕЛЬ. Як мы паведамлялі ўжо, сёлета ў вобласці быў атрыманы добры ўраджай збожжавых. І ўсё ж пад поўную патрэбнасць яго тут не хапала. Каб ліквідаваць дэфіцыт, абласны Савет народных дэпутатаў прыняў рашэнне аб стаўках мясцовага падатку на вываз тавараў у краіны СНД рублёвай зоны. Яны складаюць ад 10 да 30 працэнтаў да іх адпускной цаны. На выручаныя грошы і будзе закуплена неабходная колькасць збожжа.

У. ПЕРНІКАЎ.

ВУЧЭННЕ ДОСЛЕДНАЕ.

КАБ НЕ НАЛАМАЦЬ ДРОЎ У СТВАРЭННІ БЕЛАРУСКАЙ АРМІІ

На палігоне чуліся імітацыйныя выбухі. Адзін за адным, выныруўшы з-за лесу, накіроўваліся да «пярэдняга краю» верталёты агнявой падтрымкі. Маўчалі толькі танкі ў глыбокіх акопах ды мотастралкі ў вузкіх траншэях. У вучэбны бой яны ўступілі пазней, калі гэтага запатрабавала абстаноўка.

Так пасля маршу, абсталявання абаронных рубяжоў, адпрацоўкі шматлікіх дакументаў пачаўся розыгрыш дзеянняў у першай ва Узброеных Сілах Беларусі механізаванай брыгадзе. Па сігналу вучэбнай трывогі яна была выведзена на Гожа-Парэчскі палігон у Гродзенскай вобласці, дзе на практыцы падверглася сур'ёзнай праверцы на баявую надзейнасць. Спецыяльная група ваенных даследчыкаў Міністэрства абароны РБ ацэньвала новую арганізацыйна-штатную структуру па самых розных параметрах.

Пабываўшыя ў раёне доследнага вучэння міністр абароны Беларусі генерал-палкоўнік Павел Казлоўскі і начальнік Упраўлення грамадскай бяспекі і абаронай работы Генадзь Данілаў адзначылі, што механізаваная брыгада цалкам адпавядае высокім патрабаванням сучаснага бою і здольна вырашаць самыя складаныя задачы. А прапановы ваенных спецыялістаў па ўдасканаленню яе арганізацыйна-штатнай структуры абавязкова будуць улічаны ў далейшым.

Характэрна, што ўпершыню на камандзірскіх картах праціўнік быў чыста ўмоўны, без якой-небудзь геаграфічнай «прывязкі». Не планавалася і нанясення ядзерных удараў, таму што такой страшнай зброі ў нашых Узброеных Сілах ужо няма.

СКАНДАЛЫ

«ДЛЯ ВЫРАШЭННЯ ВЫТВОРЧЫХ ПАТРЭБ...»

ГЭТА СПАСЫЛКА СЁННЯ СУСТРАКАЕЦЦА Ў МНОГІХ ДЗЕЛАВЫХ ПАПЕРАХ. А ШТО ЗА ЕЙ?

Кажуць, што цяпер ва ўсіх на першым плане — асабістыя праблемы. Аднак пагледзець дзелавую перапіску, якую нядаўна прааналізавала Гродзенская абласная дзяржгандальінспекцыя — дык нічога падобнага. Што ні фірма, што ні спроба атрымаць дэфіцыт — усё робіцца выключна з клопатам аб вытворчасці.

Вось, напрыклад, пісьмо намесніка старшыні Гродзенскага аблвыканкома Л. Кардаша кіраўніцтву Скідальскага цукровага камбіната з просьбай адпусціць 2 тоны лімоннай кіслаты малому сельскагаспадарчаму прадпрыемству «Ніва» для вырашэння вытворчых патрэб.

Якія вытворчыя патрэбы меліся на ўвазе — у гэтым пісьме не сказана. А што на справе? Дырэктар МСП «Ніва» С. Тарасенка (ён жа дацэнт кафедры батанікі і фізіялогіі раслін сельгасінстытута), атрымаўшы 2.010 кілаграмаў лімоннай кіслаты, арганізаваў сіламі рабочых Гродзенскага гархарчгандлю яе расфасоўку ў поліэтыленавыя пакеты і 1.897 кілаграмаў рэалізаваў Віцебскай алтовай базе «Бакалея» па завышанай цане. У выніку — 448.664 рублі «навару».

Ці не праўда, цікавая аперацыя? Яшчэ пару разоў такім чынам «крутнуцца» — і гэтае МП чакае сапраўдны росквіт.

Кіраўніцтву Гродзенскага аблстатупраўлення лімонная кіслата спатрэбілася таксама для вытворчых патрэб. Можа, узамен спадзяваліся атрымаць нешта такое, без чаго сучасная статыстыка не пражыве? Ды не, проста пераблыталі вытворчыя патрэбы з асабістымі.

Вядома, што зусім не асабістымі інтарэсамі была выклікана і просьба дырэктара гродзенскага МП «Сатурн» В. Дробышава да намесніка старшыні аблвыканкома Л. Кардаша дазволіць аддраўку за межы рэспублікі партыі тэлевізараў «Гарызонт». У жніўні 80 тэлевізараў (а не 70, як дазвалялася) адгрузілі ў Туркменістан быццам бы ў абмен на рыс, сухафрукты і іншыя тавары народнага спажывання. Прычым гэту акцыю кіраўніцтва «Сатурна» абставіла як вымушаную меру, маўляў, у нас гэтыя тэлевізары попытам не карыстаюцца. Між тым, на працягу ліпеня-жніўня яны ўвогуле адсутнічалі ў продажы ў спецыялізаваным магазіне «Мелодыя», што ў Гродна. У дзень адгрузкі гэтага «непатрэбнага» ў абласным цэнтры тавару ў Туркменію пакупнікі скардзіліся ў дзяржгандальінспекцыю, што ў магазіне «Сатурн» тэлевізараў не прадаюць, іх кудысьці вывозяць. Аднак спыніць гэтую аперацыю не паспелі, паколькі ўсе дакументы былі ўжо аформлены. Што ж датычыць рысу і іншых тавараў, якімі абяцалі ашчаслівіць гродзенцаў, дык на момант праверкі з Туркменістана нічога не паступіла.

Вываз тавараў за межы рэспублікі пад прыкрыццём неіснуючага тавараабмену шырока практыкуецца і некаторымі прадпрыемствамі спажыўкааперацыі. Прычым, каб атрымаць адпаведны дазвол, не грэбнуць нават ашуканствам. Напрыклад, 16 ліпеня намеснік старшыні аблспажыўсаюза А. Чарняк просіць аблвыканком дазволіць нарыхтоўчай канторы Лідскага райспажыўсаюза вываз у Латвію лішкаў — 218 тысяч штук курыных яек узамен на кансерваваныя прадукты. На наступны дзень намеснік старшыні аблвыканкома Л. Кардаш санкцыяніруе гэту акцыю. Аднак, як потым высветлілася, у тэты дні ў нарыхтоўчай канторы яек у наяўнасці, не кажучы ўжо пра нейкія там лішкі, проста не было. 20 ліпеня 216 тысяч штук яек атрымалі з Лідскай птушкафабрыкі, уключылі іх у выкананне плана нарыхтовак і па больш высокай цане адгрузілі ў Латвію. Узамен жа адтуль, на момант праверкі дзяржгандальінспекцыяй, нічога не атрымалі.

Затое ў Навагрудку атрымалі мэблю з С.-Пецярбургскай вобласці за адгружаную туды бульбу. Праўда, і тут «вытворчыя патрэбы» носяць даволі спецыфічны характар.

Справа ў тым, што па распараджэнню дырэктара нарыхтоўчай канторы райспажыўсаюза С. Патапчыка сваім работнікам адразу са склада прадалі 3 наборы мэблі для кухні з 5 атрыманых, 2 наборы мэблі «Дубраўчанка» і 2 шафы трохдзверныя з антрэсоллю.

Намеснік дырэктара нарыхтоўчай канторы Ашмянскага райспажыўсаюза С. Кількоўскі купіў за наяўны разлік на мясцовым дражджавым заводзе 150 кілаграмаў дражджэй. Як, спытаецеся, гэта яму ўдалося? І тут паперка дапамагла — даверанасць ад арганізацыі, дзе С. Кількоўскі працуе. Праўда, ніякай справаздачы за выкарыстанне гэтага дакумента ён перад бухгалтэрыяй не рабіў, дзе, каму і па якой цане прададзены дрожджы — невядома.

Дарэчы, продаж дражджэй за наяўны разлік на Ашмянскім дражджавым заводзе стаў нормай. Па ўказанню дырэктара прадпрыемства М. Куліка за перыяд з 19 лютага па 7 жніўня г. г. 17 арганізацыям іх рэалізавалі 610 кілаграмаў, у тым ліку 120 — райсельгасхіміі, 70 — ДБУ № 28, 40 — вытворчаму аб'яднанню жыллёва-камунальнай гаспадаркі, 20 — раённай падатковай інспекцыі і г. д. І тут, відаць, на першым плане былі выключна «вытворчыя патрэбы»...

Барыс ПРАКОПЧЫК.

АФІЦЫЯЛЬНАЯ ТАБЛІЦА

тыражу выйгрышаў па чацвёртаму выпуску грашова-рэчавай латарэі Рэспублікі Беларусь, які адбыўся 30 кастрычніка 1992 года ў г. Пружаны.

У тыражы на чатыры разрады разыграна 2.168 рэчавых і 197.832 грашовыя выйгрышы на суму 1.440 тысяч рублёў.

Тыраж выйгрышаў праведзены на адзін разрад латарэі з тым, што выйгрышы, указаныя ў табліцы, выдаюцца па латарэйных білетах адпаведных серый і нумароў, якія маюцца ў чатырох разрадах.

Так, напрыклад, у табліцы ўказана, што аўтамабіль «Жыгулі» выйграў білет № 114 серыі 010597. Гэта значыць, што ўказаны выйгрыш выпаў на білет з такой жа нумарацыяй у чатырох разрадах.

У такім жа парадку разыграны і іншыя рэчавыя выйгрышы. Выйгрышы выпалі на наступныя нумары серый і нумары латарэйных білетаў у чатырох разрадах чацвёртага выпуску.

№№ серый	№№ білетаў	Назва рэчавага або размер грашовага выйгрышу	Кошт рэчавага выйгрышу ў рублях
009934	244*]	50 рублёў	—
009947	009*]	500 рублёў	—
009970	121*]	100 рублёў	—
009982	136*]	500 рублёў	—
009983	008*]	500 рублёў	—
010005	155*]	100 рублёў	—
010013	159*]	25 рублёў	—
010014	146*]	500 рублёў	—
010064	097*]	100 рублёў	—
010066	062*]	100 рублёў	—
010069	003*]	100 рублёў	—
010077	108*]	100 рублёў	—
010092	013*]	50 рублёў	—
010104	228*]	100 рублёў	—
010108	050*]	500 рублёў	—
010132	148*]	Матацыкл «ММВЗ»	890
010138	1—250	5 рублёў	—
010163	174*]	100 рублёў	—
010166	169*]	500 рублёў	—
010170	019*]	100 рублёў	—
010172	111*]	50 рублёў	—
010176	121*]	100 рублёў	—
010193	154*]	1000 рублёў	—
010202	1—250	5 рублёў	—
010215	226*]	25 рублёў	—
010219	224*]	100 рублёў	—
010226	212*]	Дыван (2×3 м)	1.890
010230	038*]	500 рублёў	—
010257	072*]	100 рублёў	—
010263	072*]	500 рублёў	—
010267	027*]	100 рублёў	—
010268	120*]	25 рублёў	—
010270	250*]	50 рублёў	—
010280	241*]	Тэлевізар «Гарызонт 61 ТЦ-411»	1.150
010318	072*]	100 рублёў	—
010325	151*]	100 рублёў	—
010345	018*]	Тэлевізар «Гарызонт 61 ТЦ-411»	1.150
010364	104*]	500 рублёў	—
010366	040*]	100 рублёў	—
010379	116*]	Халадзільнік «Мінск-126»	1.260
010419	043*]	50 рублёў	—
010430	198*]	50 рублёў	—
010441	184*]	50 рублёў	—
010448	049*]	500 рублёў	—
010453	072*]	100 рублёў	—
010460	189*]	50 рублёў	—
010476	155*]	50 рублёў	—
010478	141*]	Матацыкл «ММВЗ»	890
010479	078*]	100 рублёў	—
010525	073*]	500 рублёў	—
010529	009*]	100 рублёў	—
010547	009*]	50 рублёў	—
010561	179*]	5.000 рублёў	—
010591	126*]	100 рублёў	—
010596	116*]	25 рублёў	—
010597	114*]	Аўтамабіль «Жыгулі» ВАЗ-21063	15.800
010607	230*]	100 рублёў	—
010610	099*]	100 рублёў	—
010611	060*]	500 рублёў	—
010623	209*]	100 рублёў	—
010642	155*]	100 рублёў	—
010663	174*]	Матацыкл «ММВЗ»	890
010685	020*]	25 рублёў	—
010720	052*]	Набор мэблі для адпачынку «Журавушка»	2.580
010741	067*]	50 рублёў	—
010747	011*]	Тэлевізар «Гарызонт 61 ТЦ-411»	1.150
010754	053*]	50 рублёў	—
010758	029*]	50 рублёў	—
010764	247*]	50 рублёў	—
010774	209*]	25 рублёў	—
010800	162*]	100 рублёў	—
010803	088*]	25 рублёў	—
010813	094*]	100 рублёў	—
010829	227*]	50 рублёў	—
010842	241*]	Тэлевізар «Гарызонт 61 ТЦ-411»	1.150
010849	226*]	25 рублёў	—
010857	241*]	Тэлевізар «Гарызонт 61 ТЦ-411»	1.150
010858	1—250	5 рублёў	—
010865	075*]	500 рублёў	—
010883	048*]	Халадзільнік «Мінск-16ЕС»	774
010890	150*]	500 рублёў	—
010893	1—250	5 рублёў	—
010900	085*]	Халадзільнік «Мінск-126»	1.260
010901	170*]	5.000 рублёў	—
010903	202*]	500 рублёў	—
010927	220*]	500 рублёў	—
010956	093*]	25 рублёў	—
010980	161*]	50 рублёў	—
010989	214*]	1.000 рублёў	—
011002	163*]	50 рублёў	—
011015	096*]	Набор мэблі для кухні «Рэкта»	1.819
011018	249*]	100 рублёў	—
011030	080*]	500 рублёў	—
011043	064*]	Тэлевізар «Гарызонт 61 ТЦ-411»	1.150
011057	087*]	500 рублёў	—
011068	232*]	Тэлевізар «Гарызонт 61 ТЦ-411»	1.150
011069	1—250	Сто латарэйных білетаў	100
011071	047*]	50 рублёў	—
011075	214*]	50 рублёў	—
011087	107*]	100 рублёў	—
011137	127*]	500 рублёў	—
011139	118*]	Набор мэблі для адпачынку «Журавушка»	2.580
011165	162*]	25 рублёў	—
011174	107*]	Халадзільнік «Мінск-16ЕС»	774
011194	104*]	100 рублёў	—
011205	170*]	100 рублёў	—
011219	068*]	25 рублёў	—
011222	077*]	50 рублёў	—
011241	075*]	500 рублёў	—
011261	1—250	Сто латарэйных білетаў	100
011263	122*]	25 рублёў	—
011269	069*]	1.000 рублёў	—
011277	118*]	100 рублёў	—
011280	179*]	20.000 рублёў	—
011286	1—250	5 рублёў	—
011288	043*]	100 рублёў	—
011290	004*]	100 рублёў	—
011297	112*]	25 рублёў	—
011302	222*]	Набор мэблі для спальні «Медуніца»	2.670
011316	237*]	Дыван (2×3 м.)	1.890
011370	193*]	100 рублёў	—
011374	017*]	25 рублёў	—
011383	001*]	100 рублёў	—
011386	206*]	50 рублёў	—
011389	158*]	100 рублёў	—
011391	096*]	Дыван (2×3 м)	1.890
011416	042*]	Тэлевізар «Гарызонт 61 ТЦ-411»	1.150
011457	021*]	Халадзільнік «Мінск-126»	1.260
011465	044*]	Матацыкл «ММВЗ»	890
011469	141*]	Набор мэблі для спальні «Медуніца»	2.670
011483	116*]	Дыван (2×3 м)	1.890
011484	149*]	50 рублёў	—
011492	168*]	500 рублёў	—
011493	185*]	Набор мэблі для адпачынку «Журавушка»	2.580
011507	052*]	1.000 рублёў	—
011531	053*]	25 рублёў	—
011554	024*]	100 рублёў	—
011569	167*]	Аўтамабіль «Жыгулі» ВАЗ-21063	15.800
011599	006*]	25 рублёў	—
011604	1—250	5 рублёў	—
011611	235*]	500 рублёў	—
011632	084*]	50 рублёў	—
011637	132*]	50 рублёў	—
011640	239*]	50 рублёў	—
011648	113*]	50 рублёў	—
011658	027*]	Халадзільнік «Мінск-16ЕС»	774
011663	040*]	100 рублёў	—
011669	246*]	500 рублёў	—
011692	246*]	Дыван (2×3 м)	1.890
011699	156*]	25 рублёў	—
011703	013*]	100 рублёў	—
011723	197*]	100 рублёў	—
011769	134*]	100 рублёў	—
011778	059*]	Халадзільнік «Мінск-16ЕС»	774
011791	127*]	100 рублёў	—
011794	244*]	Набор мэблі для кухні «Рэкта»	1.819
011805	175*]	100 рублёў	—
011832	244*]	500 рублёў	—
011836	241*]	50 рублёў	—
011847	043*]	Халадзільнік «Мінск-16ЕС»	774
011861	091*]	50 рублёў	—
011896	087*]	Набор мэблі для кухні «Рэкта»	1.819
011905	222*]	100 рублёў	—
011925	075*]	500 рублёў	—
011945	007*]	25 рублёў	—
011956	193*]	100 рублёў	—
011962	049*]	Дыван (2×3 м)	1.890
011966	039*]	500 рублёў	—
011976	199*]	Халадзільнік «Мінск-126»	1.260
011986	006*]	500 рублёў	—
012000	050*]	50 рублёў	—
012002	211*]	100 рублёў	—
012057	072*]	50 рублёў	—
012060	176*]	50 рублёў	—
012064	059*]	100 рублёў	—
012077	019*]	100 рублёў	—
012090	216*]	50 рублёў	—
012100	148*]	30 рублёў	—
012101	072*]	Халадзільнік «Мінск-126»	1.260
012104	102*]	100 рублёў	—
012109	222*]	100 рублёў	—
012138	043*]	Тэлевізар «Гарызонт 61 ТЦ-411»	1.150
012143	100*]	25 рублёў	—
012147	131*]	500 рублёў	—
012166	124*]	500 рублёў	—
012181	236*]	100 рублёў	—
012182	250*]	100 рублёў	—
012188	159*]	10.000 рублёў	—
012191	162*]	100 рублёў	—
012202	189*]	25 рублёў	—
012204	043*]	50 рублёў	—
012209	029*]	100 рублёў	—
012227	095*]	Тэлевізар «Гарызонт 61 ТЦ-411»	1.150
012237	151*]	100 рублёў	—
012239	040*]	100 рублёў	—
012269	203*]	100 рублёў	—
012271	189*]	1.000 рублёў	—
012283	044*]	500 рублёў	—
012284	085*]	Набор мэблі для кухні «Рэкта»	1.819
012295	197*]	Набор мэблі для спальні «Медуніца»	2.670

* На астатнія 249 нумароў гэтай серыі выпалі выйгрышы па 3 рублі.

Парадак атрымання выйгрышаў:

1. Уладальнік латарэйнага білета, на які выпаў рэчавы выйгрыш, можа па сваёму жаданню атрымаць кошт рэчавага выйгрышу наяўнымі грашыма.

Грашовыя выйгрышы па латарэйных білетах, а па жаданню атрымальніка і грошы ўзамен рэчавых выйгрышаў коштам да 200 рублёў уключна выплачваюцца ўсімі ўстановамі Ашчаднага банка РБ. Выйгрышы звыш 200 рублёў выплачваюцца аддзяленнямі і філіяламі Ашчаднага банка РБ са штатнай колькасцю работнікаў 2 і больш чалавек.

2. Рэчавыя выйгрышы — легкавыя аўтамабілі «Жыгулі» выдаюцца праз Мінскае абласное акцыянернае таварыства «Мінск-Лада».

Латарэйныя білеты, на якія выпалі ўказаныя выйгрышы, здаюцца ў аддзяленні ці філіялы Ашчаднага банка РБ са штатнай колькасцю работнікаў 2 і больш чалавек для перасылкі ў Ашчадны банк Рэспублікі Беларусь.

Уладальнік латарэйнага білета паведамляе прозвішча, імя, імя па бацьку, індэкс і дакладны паштовы адрас, а па буйнагабарытных прадметах (матацыклы) таксама назву бліжэйшай чыгуначнай станцыі, якая робіць грузавыя перавозкі, з указаннем, да якой чыгункі адносіцца станцыя.

3. Выдача рэчавых і аплата грашовых выйгрышаў па выйграўшых латарэйных білетах праводзіцца толькі на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

Астатнія рэчавыя выйгрышы выдаюцца магазінамі ва ўсіх гарадах і раёнах па месцу знаходжання ўстановы Ашчаднага банка, якая заверыла выйграўшы латарэйны білет.

Пры змяненні цэн на прадметы, разыграныя ў знасці рэчавых выйгрышаў, уладальнік выйграўшага латарэйнага білета атрымлівае або даплачвае розніцу наяўнымі грашыма.

4. У выпадку, калі асобныя прадметы, разыграныя ў латарэі, будуць зняты з вытворчасці і адсутнічаюць у гандлёвай сетцы, уладальнік выйграўшага білета можа па ўласнаму меркаванню атрымаць аналагічны тавар з тых, што ёсць у наяўнасці, большага ці меншага кошту, даплаціўшы ці атрымаўшы розніцу ў цане.

5. Выйграўшыя латарэйныя білеты могуць быць прад'яўлены для аплаты і для атрымання рэчавага выйгрышу па 30 чэрвеня 1993 года ўключна.

Пасля гэтага тэрміну латарэйныя білеты страчваюць сілу і да аплаты не прымаюцца.

Гэта табліца з'яўляецца афіцыяльным дакументам, па якому робіцца выдача рэчавых і выплата грашовых выйгрышаў. Выдача выйгрышаў пачынаецца ўстановамі Ашчаднага банка РБ пасля атрымання наступнага нумара газеты за тым, у якім была апублікавана афіцыяльная табліца.

Да ведама грамадзян!

Навагодні выпуск грашова-рэчавай латарэі РБ адбудзецца 24 снежня 1992 года ў г. Жодзіна.

Старшыня намісіі: КАЗАРЭЗ Іван Сяргеевіч — намеснік старшыні выканаўчага камітэта Пружанскага раённага Савета народных дэпутатаў.

Адказны сакратар: ХАЛІМОН Генадзь Анатольевіч — інспектар Ашчаднага банка Рэспублікі Беларусь.

У бацькіў згадкі

Які ледабур лепшы?

Напярэдадні ледастаў, а да яго трэба падрыхтавацца загадзя. Прамысловасць выпускае ледабуры некалькіх відаў: шнэкавыя, «лыжка», «стакан», пешні тыпу «рыдлёўкі», «шаблі», «пікі», «долата». У пешні верхняя частка драўляная, ніжняя

складаецца з металічнага лома, да канца якога прыварваецца рабочая частка са спецыяльным вуглом заточкі.

Аматары падлёднай лоўлі аддаюць перавагу шнэкавым «калаўротам». Яны незаменныя для людзей пажылога ўзросту, у якіх сіла ў руках ужо не тая, што была ў маладосці.

Ледабуры адносна лёгкія — 2,8—3,5 кг. Імі свідруюць лункі ў тоўстым ільдзе дыяметрам 110—120 мм за тры хвіліны з роўнымі і чыстымі краямі.

Ледабур «лыжка» (1,5—2 кг) робіць лунку дыяметрам 120—130 мм, выпільваючы слупок лёду. З ім добра і лёгка працаваць як па тоўстым і сухім, так і па мокрым ільдзе. Адзіны яго недахоп — у неабходнасці заточваць лязо. У хатніх умовах гэта зрабіць цяжка —можна пашкодзіць паўсферную паверхню, змяніўшы вугал атакі. Заточванне «лыжкі» пажадана рабіць у майстэрнях.

Шнэкавыя і ледабур «стакан» лёгка затачыць у хатніх умовах. Гэтыя ледабуры цяжкія (да 7,5—8,5 кг). Лунка атрымліваецца дыяметрам 180—200 мм. У асноўным выкарыстоўваюцца па тоўстым ільдзе. Праца з імі патрабуе шмат сілы.

Усе сучасныя ледабуры складаюцца з трох частак: галоўнай з нажамі, стрыжня і калаўрота. Яны лёгка разбіраюцца і ўкладваюцца ў чахлы, прычым нажы хаваюць у спецыяльныя капронавыя «ножны».

Азы падлёднага лову

● Пры вуджанні плоткі больш падыходзяць мармышкі светлага тону, бліскучыя; акуня, ляшча, гусцяры—цёмнага тону, пацьмянелыя.

● Лоўлю акуня па першым ільдзе лепш пачынаць на блешню, а калі рыба пачынае брацца дрэнна і бліжэй да сярэдзіны зімы — пераходзіць на мармышку. Памятайце — чым горш бярэцца рыба, тым танчэйшай павінна быць лёска і меншага памеру мармышка.

● Праз часта зробленыя лункі, асабліва ў сонечны дзень, пранікае святло і адпужвае рыбу. Таму не трэба на мелкаводных участках і на глыбіні да трох метраў рабіць лункі бліжэй чым на 3—4 метры адна ад адной.

● Па першым ільдзе, калі рыба бярэцца добра, лепш лавіць на мармышку буйнога памеру. У сярэдзіне зімы, калі рыба малаактыўная і бярэцца слаба — лепш выкарыстоўваць дробную мармышку. З павелічэннем глыбіні вуджання трэба павялічваць і вагу мармышкі. На малых глыбінях лепш карысташа больш лёгкімі мармышкамі.

Парады бывалых

● Восенню на рэках, азёрах можна сустрэць месцы, дзе вада пакрыта лісцямі. Туды збіраецца ўсякая рыба. Калі лавіць з лодкі — ціха развядзіце лісце, зрабіце некалькі «вокнаў» і па чарзе «аблавіце» іх.

● **Донкамі восенню «дастаць» ляшча цяжка. Гэта рыба хаваецца ў ямінах, клюе кепска, асцярожна. А вось сом стаў актыўным. Ён шукае ежу часта і сярод дня.**

● П'яўкі — добрая прынада. Іх лёгка здабыць, калі ў зараснікі вадзяной расліннасці апусціць на некалькі гадзін мясныя адходы, загарнуўшы ў сцябліны асоту, чароту.

● **«Улоўнасць» кручкоў павышаецца пры большым загібе. Нагрэйце кручок да чырвані, ахаладзіце і загніце па жаданню. Потым яго трэба абавязкова зноў загартаваць.**

● У якасці фарбавальніка лёскі можна выкарыстаць кару алешыны, дуба, ліст і лупінне грэцкага арэха. Гатуюць адвар на маленькім полымі на працягу гадзіны, працэджваюць, дадаюць соль і ахалоджваюць. У гэтым растворы да поўнага яго астывання і фарбуюць лёску.

САМ САБЕ МЕТЭАРОЛАГ

Чаго чакаць ад воблака?

Кожную раніцу, выходзячы з дому, кожны з нас імкнецца прадугадаць, якое сёння будзе надвор'е, будзе дождж ці сонца, будзе ціха ці ветрана... Углядаемся ў неба, быццам шукаючы адказ на гэтыя пытанні. А ўглядацца сапраўды трэба, бо яно — яснае ці воблачнае — можа падказаць многае.

Бо што такое воблака? Паветра з утрыманнем вадзяных пароў, узнімаючыся, ахалоджваецца, частка пароў кандэнсуецца і ўтварае воблакі або туман. Прафесіянальныя метэаролагі звычайна вызначаюць воблачнасць колькасцю воблакаў, якія закрываюць неба, па 10-бальнай сістэме, іх формай, вышынёй. Часта на небе назіраюцца адначасова некалькі форм воблачнасці, асноўныя з якіх — перыстыя, слаістыя, кучавыя, дажджавыя, а таксама прамежкавыя паміж гэтымі формамі, і змешаныя. І зірнуўшы на неба, можна сёе-тое зразумець наконт надвор'я.

Вось найбольш адметныя характарыстыкі воблачнасці.

ВОБЛАКІ ВЕРХНЯГА ЯРУСА (вышэй 6 кіламетраў). **Перыстыя воблакі** маюць выгляд палос, нітак, валокнаў, пер'я. Далікатнага белага колеру. Стварацца з лёдавых крышталікаў. **Перыста - слаістыя воблакі** — тонкі белаваты вэлюм, які надае небу малочнае адценне. Разглядваючы скрозь іх сонца або месяц, можна назіраць бясколерныя светлыя кольцы дыяметрам у многа разоў большым за бачны дыяметр сонца або месяца (т. зв. кругі Гало). **Перыста - кучавыя воблакі** ўтвараюць на небе «баранчыкі» малога памеру, якія размяшчаюцца часта групкамі або радамі; праз усе воблакі верхняга яруса праскрэчвае сонца, даючы на зямлю слабыя цені. Але ападкаў усе гэтыя воблакі верхняга яруса не даюць.

ВОБЛАКІ СЯРЭДНЯГА ЯРУСА (ад 2 да 6 кіламетраў вышынёй). **Высокаслаістыя воблакі** — роўная белая або сіняватая пелена, якая пакрывае ўсё неба; сонца прасвечвае праз яе нібы праз матавае шкло, не даючы ценю. Шчыльныя воблакі могуць даваць ападкі ў выглядзе асобных кропель або сняжынак. **Высокакучавыя воблакі** ўтвараюць грады, шары, застыўшыя хвалі. Сонца і месяц, прасвечваючы праз тонкія воблакі, утвараюць вакол сябе кольцы або вянцы, якія маюць афарбоўку ў колерах вясёлкі.

ВОБЛАКІ НІЖНЯГА ЯРУСА (да 2 кіламетраў вышынёй). **Слаістыя воблакі** — брудная пелена воблакаў, якая амаль не ўтварае малюнка. Сонца праз іх не прасвечвае. Але і ападкаў яны не даюць. **Слаістадажджавыя воблакі**—шэрабрудныя, нізкія воблакі ірванай формы, з якіх часта выпадае дождж або снег. Часта назіраюцца на фоне слаістых воблакаў. **Слаістакучавыя воблакі** — вельмі падобныя на высокакучавыя, але больш шчыльныя і размешчаныя на вышыні 2 кіламетры. «Хвалі» вялікіх памераў. Сонца праз іх не прасвечвае. Але ападкаў гэтыя воблакі не даюць.

ВОБЛАКІ ВЕРТЫКАЛЬНАГА РАЗВІЦЦЯ (ніжняя граніца — ад 500 метраў, верхняя — да ўзроўню перыстых воблакаў, г. зн. 6—7 кіламетраў). **Кучавыя воблакі** — характэрныя воблакі, якія маюць плоскую аснову і купалападобную форму. Дажджу не даюць. Пры інтэнсіўным развіцці ўверх пераходзяць у кучава-дажджавыя воблакі, якія маюць свінцовы, грозны выгляд, верхняя частка часта размытая, пераходзячы ў перыстыя воблакі. **Кучава-дажджавыя воблакі** — самыя ападкавыя воблакі, якія нараджаюць ліўневыя дажджы, град, снег.

Вядома, не толькі воблачнасць вызначае характар надвор'я. Тут яшчэ і вецер, і тэмпература, і вільготнасць паветра, і шмат яшчэ якіх прадпасылак. Але ж веданне характару воблачнасці дае магчымасць скласці свой асабісты прагноз на бліжэйшы час.

ПРАГРАМА ТЭЛЕ-ПЕРАДАЧ

9 лістапада, ПАНЯДЗЕЛАК

Беларускае тэлебачанне

16.30. Геаграфія Беларусі. 9-ы клас.
17.00. «Блакітная страла». «Дзявочая вежа». «Футрачка для хмары». «Квартэт ква-ква». Мультфільмы.
18.00. «Рэпартаж ля краю бездані». Дак. фільм.
18.50. «Накцюрн».
19.00. Абласныя навіны (Брэст).
19.10. Позірк з замежжа. Развагі пра беларускасць амерыканца Яна Запрудніка.
19.45. «Бар'еры». Спартыўная база інваліднага спорту. Прамая лінія.
20.40. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.25. Спартыўны тэлекур'ер.
21.45. «Пакінуць у сэрцы след...» Народныя ўмельцы Крупскага раёна.
22.45. НІКа.
23.00. Шоў-казіно.

Канал «Астанкіна»

17.25. Зорная гадзіна.
18.05. Футбольны агляд.
18.35. Мастацкі фільм «Любімы раджа» (Індыя). 1-я серыя.
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.40. «Любімы раджа». 2-я серыя.
21.45. «Новая студыя» прадстаўляе. Вамонд.
22.00. Джэм-сейшн.
22.25. Аднак.
22.35. Мы.
22.40. Сітуацыя.
23.00. Навіны.
23.20. Крывы эфір.
23.40. Яўгеній і...
23.50. Оба-на!
0.30. «Стаянка поезда—дзве хвіліны». Мастацкі фільм.

Канал «Расія»

7.00. Весткі.
7.20. «Там, на невядомых сцежках». Мастацкі фільм.
8.25. Праграма «03».
8.55. «Чутна было ўдалечыні». Дак. фільм.
9.20. Наш сад.
9.50. Непазнаны Сусвет.
10.20. «Дык давайце арганізуем вялікі карагод».
11.20. Мастацтва адлюстравання. «Як паказаць мастака?»
11.50. Пілігрым.
12.35. Маскі-шоў.
13.00. Весткі.
13.20. Маскі-шоў.
13.45. «Бурда модэн» прапануе...
14.15. На канцэрце Тамары Гвердцытэлі.
15.15. «Ваша права». Перадача 1-я.
16.10. Тэніс. Кубак Крамля.
17.05. Залатая шпора.
17.35. Настальгічныя вячоркі.
18.05. Клара Новікава ў гасцях у пісьменніку А. Кабакова і М. Мішына.
18.35. «Свежая заечына». Мультфільм (ЗША).
18.45. Свята кожны дзень.
19.00. Весткі.
19.25. Дэтэктыў па панядзелках. «Транссібірскі экспрэс».
21.00. На пытанні Андрэя Каравулава адказвае Марыя Міронава.
22.00. Весткі.
22.25. Крымінальныя паведамленні.
22.35. Спартыўная карусель.
22.40. Тэніс. Кубак Крамля.

10 лістапада, АЎТОРАК

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. «Прышэлец». Дак. фільм.
9.00. Геаграфія Беларусі. 9-ы клас.
9.30. «Свабоднае падзенне». Мастацкі фільм.
16.30. Беларуская мова. 1-ы клас.
16.45. Экран дзіцячага фільма. «Мы—хлопцы жывучыя».
18.00. Дак. фільмы «Вяроста сібірская», «Нерасталы іней Волагды», «Калі цвіце «каралева» ночы».
19.00. Абласныя навіны (Віцебск).
19.10. Трэці тайм. Прамая лінія.
19.55. Процістаянне. Маральна-прававая праграма.
20.40. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.25. Тэлебіржа.
21.35. На сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. Пасля заканчэння — Беларускія музычныя весткі. НІКа.

Канал «Астанкіна»

5.00. Навіны.
5.20. Раніцяя гімнастыка.
5.30. Раніца.
7.50. Фірма гарантуе.
8.00. Навіны.
8.20. «Багатыя таксама плачуць».
9.05. Футбольны агляд.
9.35. У свеце жывёл (з сурдаперакладам).
10.15. Рок-урок.
11.00. Навіны (з сурдаперакладам).
11.20. «Угрум-рака». 1-я серыя «Громаны».
12.45. «Круты паварот». Мастацкі фільм.
14.00. Навіны (з сурдаперакладам).
14.25. Дзелавы веснік.
14.40. Свет грошай Адама Сміта.
15.15. Уолт Дысней прадстаўляе...
16.05. Наш музычны клуб. «440 герц».
16.50. Прэс-экспрэс.
17.00. Навіны.
17.25. «Спадчына, ад якой мы адмаўляемся».
18.00. «Багатыя таксама плачуць».
18.45. Мініяцюра.
19.00. Тэма.
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.40. Канцэрт, прысвечаны Дню міліцыі. У перапынку (23.00)— Навіны.
24.00. «Круты паварот». Мастацкі фільм.

Канал «Расія»

7.00. Весткі.
7.25. Час дзелавых людзей.
7.55. Момант ісціны.
8.50. Наш сад.
9.20. «Дамашні клуб».
9.35. «Давай паціснем адзін аднаму руку...» Н. Ніціцкі.
10.50. Мульці-пульці.
11.00. «Падсудны». Мастацкі фільм.
12.25. «Справа пра прапаўшага зайца». Мультфільм (ЗША).
12.35. Т. Ін. Ка.
12.40. Сялянскае пытанне.
13.00. Весткі.
15.00. Тэлебіржа.
15.30. Адпачыванне.
16.00. Там-там-навіны.
16.15. Тэніс. Кубак Крамля.
17.00. Майстэрня музыкі. Сяргей Мальцаў.
17.30. Парламенцкі веснік.
17.45. Залатая галіна. «Рулявая кніга».
18.45. Свята кожны дзень.
19.00. Весткі.
19.25. «Санта-Барбара».
20.15. Кабарэ «Вязгуздзіца».
21.05. Кліч Вадалея.
22.00. Весткі.
22.25. Спартыўная карусель.
22.30. Тэніс. Кубак Крамля.
22.45. Сёння ў ВС Расіі.
23.00. З залы Канстытуцыйнага суда Расіі.
23.30. Сола.

11 лістапада, СЕРАДА

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. «Чэгем». Кінанарыс.
9.00. Беларуская мова. 1-ы клас.
9.15. «Мультыплікацыя і... вікінгі». Праблемы анімацыйнага кіно ў Беларусі.
9.55. «Гонка веку». Мастацкі фільм.
16.30. «Сказ пра Скамароха і цара Гароха». Спектакль Магілёўскага абластэатра.
17.40. «У стылі джаз-рэтра». Фільм-канцэрт.
18.00. Дак. фільмы «Матыльні высакагор'я». «Ружовы вецер». «У дэльце Ілі».
19.00. Абласныя навіны (Гомель).
19.10. Рэпартаж з адкрыцця нацыянальнай выстаўкі «Польшча-92».
19.30. «Гэта—Варшава». Дак. фільм.
20.00. Палітычны калейдаскоп. Якой быць мясцовай уладзе?
20.40. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.25. На сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. Пасля заканчэння—рэйтынг; НІКа; П. Чайкоўскі. Фантазія «Франчэска да Рыміні».

Канал «Астанкіна»

5.00. Навіны.
5.20. Раніцяя гімнастыка.
5.30. Раніца.
7.50. Фірма гарантуе.
8.00. Навіны.
8.20. «Багатыя таксама плачуць».
9.50. Наш музычны клуб «440 герц».
10.30. «Асацыяцыя». Дак. фільм.
10.50. «Мы ідзём шукаць». Мультфільм.
11.00. Навіны (з сурдаперакладам).
11.20. «Угрум-рака». 2-я серыя «Анфіса».
12.40. «Пакуль не выпаў снег...» Мастацкі фільм.
14.00. Навіны (з сурдаперакладам).
14.25. Тэлемікст.
15.15. «Пчала Мая».
16.05. Падарунак меламану. Іграе В. Трацяк.
16.35. Як дабіцца поспеху.
16.50. Прэс-экспрэс.
17.00. Навіны.
17.25. Вагон 03.
18.00. «Багатыя таксама плачуць».
18.45. Грамадская думка.
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.40. Мастацкі фільм «Камедыянты» (ЗША). 1-я серыя.
21.55. Тайна хімічнай зброі.
22.05. Тэлебаль, прысвечаны X фестывалю моладзі «Варонеж-92». У перапынку (23.00)—Навіны.
23.50. «Пакуль не выпаў снег...». Мастацкі фільм.

Канал «Расія»

7.00. Весткі.
7.30. Час дзелавых людзей.
8.00. Кліч Вадалея.
8.50. Залатая галіна.
9.50. Паралелі. «Дзелавая нарада».
10.05. Прысвячэнне С. Я. Лемешаву.
11.00. «Санта-Барбара».
11.50. «АЛСІВ: неба адно на ўсіх...»
12.35. Т. Ін. Ка.
12.40. Сялянскае пытанне.
13.00. Весткі.
15.00. Сігнал.
15.15. Далёкі Усход.
16.00. Там-там-навіны.
16.15. Тэніс. Кубак Крамля.
17.00. Хрысціянская праграма.
17.30. Гутаркі ў «Метраполі».
17.50. Давайце разбяромся.
18.05. Апазіцыя.
18.45. Свята кожны дзень.
19.00. Весткі.
19.25. «Санта-Барбара».
20.15. Вечары ў доме Гогаля.
21.00. Бізнес і палітыка.
22.00. Весткі.
22.25. Спартыўная карусель.
22.30. Сёння ў ВС Расіі.
22.45. З залы Канстытуцыйнага суда Расіі.
23.00. Тэніс. Кубак Крамля.
23.30. Вінілавыя джунглі.

12 лістапада, ЧАЦВЕР

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. «Пяць вечароў». Мастацкі фільм з субцітрамі.
16.30. Выяўленчае мастацтва. 3-ці клас.
16.50. «З робатамі не жартуюць». Мастацкі фільм.
18.00. «Сем азёраў». Дак. фільм.
18.15. «Накцюрн».
18.30. Як пачаць уласную справу. Дыялог амерыканскіх бізнесменаў.
19.00. Абласныя навіны (Гродна).
19.10. Зачытайце маё пісьмо...
19.20. Хакей. Кваліфікацыйны турнір да юніёрскага чэмпіянату свету (група «С»). Зборная Беларусі — зборная Украіны. У перапынку (19.55) — Тыдзень беларускага ўрада.
20.50. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.25. На сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. Пасля заканчэння — студыя «КІТ»; НІКа.

Канал «Астанкіна»

5.00. Навіны.
5.20. Раніцяя гімнастыка.
5.30. Раніца.
7.50. Фірма гарантуе.
8.00. Навіны.
8.20. «Багатыя таксама плачуць».
9.50. ...Да 16 і старэйшым.
10.30. Мультфільмы «Серца храбраца». «Рублі старога каравэлніка».
11.00. Навіны (з сурдаперакладам).
11.20. «Угрум-рака». 3-я серыя «Здрадніцтва».
12.20. «Інцыдэнт з «Чорнай птушкай». Мастацкі фільм (Кітай).
14.00. Навіны (з сурдаперакладам).
14.25. Тэлемікст.
15.15. «Пчала Мая».
16.05. Новыя імёны. Канцэрт.
16.15. Фільм—дзецям. «...А шарык ляціць».
16.50. Прэс-экспрэс.
17.00. Навіны.
17.20. ...Да 16 і старэйшым.
18.00. «Багатыя таксама плачуць».
18.40. «Двое ў адной лодцы». Пра фільмы А. Міндадзе і В. Абдрашытава.
19.00. Партрэт на фоне. І. Кірылаў.
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.40. Лато-«Мільён».
21.10. Мастацкі фільм «Камедыянты» (ЗША). 2-я серыя.
22.25. «Хіт-парад Астанкіна». У перапынку (23.00) — Навіны.
24.00. «Інцыдэнт з «Чорнай птушкай». Мастацкі фільм (Кітай).

Канал «Расія»

7.00. Весткі.
7.20. Час дзелавых людзей.
7.50. Бізнес і палітыка.
8.45. «Увага: здымаю!»
9.00. Залатая шпора.
9.30. Праграма «03».
10.00. Права на святыні.
10.30. Настальгічныя вячоркі.
11.00. «Санта-Барбара».
11.50. Крыніцы.
12.35. Т. Ін. Ка.
12.40. Сялянскае пытанне.
13.00. Весткі.
15.00. Вучыцца рынку.
15.30. «Бадабоні». Праграма для дашкольнікаў (Францыя).
15.50. Там-там-навіны.
16.05. Тэніс. Кубак Крамля.
17.00. Так і жывём.
17.30. Парламенцкі веснік.
17.45. «Ваша права». Перадача 2-я.
18.35. «Дурнаваты воўк». Мультфільм (ЗША).
18.45. Свята кожны дзень.
19.00. Весткі.
19.25. «Санта-Барбара».
20.15. У свеце аўта- і мотаспорту.
20.45. Спецыяльны камерцыйны веснік.
21.00. Адкрыты ўрок гісторыі і геаграфіі.
21.45. Дайце народу зямлю.
22.00. Весткі.
22.30. Тэніс. Кубак Крамля.
22.45. Сёння ў ВС Расіі.
23.00. З залы Канстытуцыйнага суда Расіі.
23.30. «Насланнё». Фантазіі на тэму аповесці Тэнесі Ульямса «Рымская вясна місіс Стоўн».

13 лістапада, ПЯТНІЦА

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. «Рамэо і Юлія». Фрагмент з балета на музыку Г. Берліёза.
9.00. Выяўленчае мастацтва. 3-ці клас.
9.20. «Вяселле ў Малінаўцы». Мастацкі фільм.
16.30. «Дом з прывідамі». Мастацкі фільм з субцітрамі.
18.00. Дак. фільмы «Трава ля дома», «Фарбы зямлі роднай».
18.30. Рамансы Л. Абелёвіча на вершы Ф. Цютчава.
19.00. Абласныя навіны (Магілёў).
19.10. Стэп. Кінанарыс.
19.20. Хакей. Зборная Беларусі —зборная Казахстана. У перапынку (19.55) — Калыханка.
20.55. «Фірма Пушэ». Тэленарыс.
21.00. Панарама.
21.25. Тэлебіржа.
21.35. На сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. Пасля заканчэння — «Падарожжа на Амерыцы». Перадача 2-я; НІКа; «Вяселле ў Малінаўцы». Мастацкі фільм.

Канал «Астанкіна»

5.00. Навіны.
5.20. Раніцяя гімнастыка.
5.30. Раніца.
7.50. Фірма гарантуе.
8.00. Навіны.
8.20. «Багатыя таксама плачуць».
9.05. Мультфільм.
9.25. Кіно падарожнікаў (з сур.дапераклад).
10.15. Сучаснікі пра Л. Когана.
11.00. Навіны (з сурдаперакладам).
11.20. «Угрум-рака». 4-я серыя «Крах».
12.35. «Дзень нараджэння ката Леапольда». Мультфільм.
12.45. «Святло ў акне». Мастацкі фільм.
14.00. Навіны (з сурдаперакладам).
14.25. Брыдж.
14.50. Бізнес-клас.
15.10. «Пчала Мая».
16.00. Выступае сямейны ансамбль Нізамутдзінавых (Ташкент).
16.10. Цэнтр.
16.50. Прэс-экспрэс.
17.00. Навіны.
17.20. Вагон 03.
17.50. Ваеннае рэвю.
18.20. Чалавек і закон.
18.50. Поле цудаў.
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.40. Мастацкі фільм «Прыгаворваны».
22.15. ВІД прадстаўляе. Паліт-бюро.
22.50. Музагляд. У перапынку (23.00) — Навіны.
23.50. Чалавек тыдня.
0.05. Сталоне-шоў.

Канал «Расія»

7.00. Весткі.
7.25. Час дзелавых людзей.
7.55. Адкрыты ўрок гісторыі і геаграфіі.
8.40. «ТБ-атэлье».
8.55. «Насланнё». Фантазіі на тэму аповесці Тэнесі Ульямса «Рымская вясна місіс Стоўн».
9.55. Тэма з варыяцыямі. «Не падайце духам, паручык Галіцын...»
10.50. «Свежая заечына». Мультфільм (ЗША).
11.00. «Санта-Барбара».
11.50. «З любоўю да Чэхава».
12.35. Т. Ін. Ка.
12.40. Сялянскае пытанне.
13.00. Весткі.
15.00. Тэлебіржа.
15.30. «Як жывеш, Уфа?»
16.15. Тэніс. Кубак Крамля.
17.00. М-трэст.
17.15. Там-там-навіны.
17.30. Як перазімаваць жыхару Поўначы.
17.45. «Дзікі Джэк». Мастацкі фільм. 2-я серыя.
18.35. «Брыдкі трус». Мультфільм (ЗША).
18.45. Свята кожны дзень.
19.00. Весткі.
19.25. «Вулачка». Мастацкі фільм.
20.50. Крымінальныя паведамленні.
21.00. «Монстр». (Расія — ЗША). Фільм 1-ы «Сталін і ўлада».
22.00. Весткі.
22.25. Спартыўная карусель.
22.30. Сёння ў ВС Расіі.
22.45. З залы Канстытуцыйнага суда Расіі.
23.00. Тэніс. Кубак Крамля.
23.30. Вячэрні салон.

14 лістапада, СУБОТА

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. «Забытыя рэчы». Мастацкі фільм.
10.00. Паказвае Віцебск. Музычная праграма.
11.00. Тыдзень планеты.
11.15. Урокі здароўя. Ёга ў нашым жыцці. Перадача 1-я.
11.45. У. Кандрусевіч. «Джулія». Спектакль Дзяржаўнага тэатра музычнай камедыі Беларусі. Частка 1-я.
13.15. 20 мінут рэдактара.
13.35. Белпака першыя крокі. Экалогія і стварэнне ў Магілёве новых прадпрыемстваў.
13.55. «Знайсці сябе». Тэленарыс.
14.15. «Джулія». Частка 2-я.
15.25. Яшчэ раз пра дзяржаўную ўласнасць. На пытанні тэлегледачоў адказвае старшыня Вышэйшага гаспадарчага суда Беларусі У. В. Войка.
16.05. Каляровая карусель. Конкурс дзіцячай творчасці ў Палацы прафсаюзаў г. Мінска.
17.05. Адраджэнне. Культурна-асветніцкая праграма.
17.50. Шанц. Шоў-гульня.
18.35. Да 925-годдзя Оршы. Частка 1-я.
19.20. «Адам, Энгельс і... поліэтыленавыя мяшочкі». Роздум пра лёс калгаса імя Энгельса Гарадоцкага раёна. Перадача 1-я.
19.50. Зямля пад белымі крыламі. Частка 2-я.
20.40. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.25. Тэлебіржа.
21.40. «Сінема» прадстаўляе: мастацкі фільм «Імя ружы» (ФРГ, Італія, Францыя).
23.45. НІКа.
24.00. «Відзьма-нявідзьма». Навіны відэа-кіно-аўдыё.

Канал «Астанкіна»

6.00. Навіны.
6.20. Раніцяя гімнастыка.
6.30. Суботняя раніца дзелавога чалавека.
7.30. Спорт-шанц.
8.00. «Марафон-15» — малышам. Мультфільм «Вамсі» (Швецыя).
8.25. Дапамажы сабе сам.
9.05. Мультпамфлет. «Гістарычны эцюд».
9.10. Аўтограф па суботах.
9.40. Тэхнадром.
9.50. Відавочнае-невераятнае.
10.20. Стыль.
10.50. Спявае фальклорнае трыо «Рамонак» (Мінск).
11.05. Справа.
11.35. Авіякасмічны салон.
11.50. Служэнне муз не церпіць мітусні.
12.20. Музычны кіёск.
12.50. «Трэхпадзенне, ці Пазнанне дабра і зла».
13.00. Дак. фільм «Няздзейсненая мара Мікалая Казакова» (Францыя). Фільм 4-ы.
14.00. Навіны (з сурдаперакладам).
14.20. Мастацкі фільм «Каралеўства крывых люстэркаў».
16.00. Мультпамфлет. «Аб з'явах і існаванні».
16.05. Чырвоны квадрат.
16.45. Мультфільм «Дракуліта-вампіраня» (Францыя).
17.10. Шчаслівы выпадак.
18.10. Фільмы А. Міндадзе і В. Абдрашытава. «Паляванне на ліс».
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.40. «Вязмежны Разанаў».
22.10. Брава.
23.00. Навіны.
23.15. Мастацкі фільм «Сям'я ваўкалакаў».

Канал «Расія»

7.00. Весткі.
7.25. Свет спорту вачамі фірмы «Жылет».
7.55. Паралелі. Дзіцячая студыя «Фарта» працягвае жыць.
8.20. Раформа-блюз.
8.55. Відэаканал «Плюс адзінаццаць».
10.10. Бумеранг.
10.55. Майстры. Скульптар А. Комаў.
11.40. Кар'ера.
12.40. Сялянскае пытанне.
13.00. Весткі.
13.20. Тэніс. Кубак Крамля.
14.50. Пілігрым.
15.35. Казырная дама.
16.05. Футбол без граніц.
17.00. «К-2» прадстаўляе: «Абзац».
17.30. Парламенцкі веснік.
17.45. Вуснамі дзіцяці.
18.15. Зоркі Амерыкі.
18.45. Свята кожны дзень.
19.00. Весткі.
19.20. «Свецік». Мастацкі фільм.
20.35. Тэніс. Кубак Крамля.
21.00. Кантрасты.
21.40. Рэпарцёр.
22.00. Весткі.
22.25. Спартыўная карусель.
22.30. Асарці.
23.00. Праграма «А».
23.30. Ад лібітум.
24.00. «След на зямлі».

15 лістапада, НЯДЗЕЛЯ

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. Як захаваць зрок дзіцяці. Перадача 2-я.
9.00. «Екацярынінскі палац». Прадстаўляюць тэлежурналісты Санкт-Пецярбурга.
9.10. Урокі здароўя. Ёга ў нашым жыцці. Перадача 2-я.
9.40. Латарэя аўтографаў.
10.40. Белыя і чорныя. Шашачны клуб.
11.15. Майстры оперных сцэны. Частка 1-я.
12.10. Распавядае Іраклій Андронікаў.
12.55. «Суперкніга». 25-я серыя.
13.30. Майстры оперных сцэны. Частка 2-я.
14.30. Для дзяцей. Сем колераў радасці.
15.10. Хакей. Зборная Беларусі — зборная Літвы. 3-ці перыяд.
15.45. Дом мажор. Да 60-годдзя Беларускай музычнай акадэміі.
16.30. Сістэма «Ньюс».
16.50. «Родных слоў струмень празрысты». Сустрэча з майстрамі мастацкага слова, артыстамі Белдзяржфілармоніі.
17.35. Міс Польшча. Забаўляльная праграма.
19.20. «Адам. Энгельс і... поліэтыленавыя мяшочкі». Роздум пра лёс калгаса імя Энгельса Гарадоцкага раёна. Перадача 2-я.
19.50. «Восень з саксафонам». Музычная навела.
20.00. Панарама.
20.25. «Фарбы Ала-Тоа». Кінанарыс.
20.40. Калыханка.
21.00. Студыя «Тэлесябрына». «Пепсі-топ-20».
21.45. «Сінема» прадстаўляе: мастацкі фільм «Капітан» (Францыя).
23.20. Каралеўскае паляванне. Шоў-казіно.

Канал «Астанкіна»

6.00. Гадзіна сілы духу.
7.00. Тыраж «Спортлато».
7.15. Мультфільмы.
7.45. Дак. фільм «Справа пра помнік Імператару Аляксандру III».
8.30. Мультфільм «Дэнвер — апошні з дыназаўраў» (Францыя).
9.00. Пакуль усе дома.
9.30. Ранішняя зорка.
10.20. Пад знакам «пі».
11.10. «Як браты пальцы пасварыліся». Мультфільм.
11.15. «Прыгоды Чорнага Прыгажуна». 18-я серыя «Сяржант-вярбоўшчык».
11.40. КТБ-І і канал «Франс інтэрнасьяналь» прадстаўляюць: 12.30. Мультфільм «Піф і Геркулес».
12.40. Дак. фільм «Падводная адысея каманды Кусто».
13.30. «Дом на Валхонцы». Фільм 5-ы.
14.00. Навіны (з сурдаперакладам).
14.20. Дыялог у прамым эфіры.
15.00. Клуб падарожнікаў.
15.50. Канцэрт.
16.05. Панарама.
16.45. Тэлелоцыя.
16.55. Уолт Дысней прадстаўляе...
17.45. Навіны.
18.00. Цудоўная сямёрка.
18.55. Мастацкі фільм «Шчырасць Іаана Першадрукара». 1-я серыя.
20.05. «Тоска» ў помніках архітэктуры». Фільм-опера тэлекампаніі «РАІ» (Італія).
21.00. Выхінкі.
21.45. Спартыўны ўік-энд.
22.00. Працяг фільма оперы «Тоска».
23.20. Навіны.
23.40. «Святло ў акне». Мастацкі фільм.

Канал «Расія»

7.00. Весткі.
7.25. «Дурнаваты воўк», «Брыдкі трус». Мультфільмы (ЗША).
7.45. Танцавальны марафон.
8.30. Фальклор. «Невядомыя культуры».
9.00. Шэсць сутак.
9.20. «Прыгода ў каралеўстве». 12-я серыя.
9.50. Аты-баты...
10.20. Тэлекрасворд. «Муз-біржа».
10.50. Мультфільм «Дараэман» (Японія). 10-я серыя.
11.05. «Карупцыя».
12.00. Тэлегульня «Лога».
12.30. Тэніс. Кубак Крамля.
13.00. Весткі.
13.20. «Не высечы...» Вядучы — У. Цветаў.
13.35. Тэніс. Кубак Крамля.
14.30. Нядзеля ў правінцыі. «Адупка».
15.15. «Не лыкам шытыя».
15.40. Познер і Донах'ю.
16.10. У свеце жывёл.
17.10. «Новы сезон на Арбаце».
18.05. «Голад не цётка». Мультфільм (ЗША).
18.15. Клуб «Жоўтая падводная лодка».
18.45. Свята кожны дзень.
19.00. Весткі.
19.20. Фестываль класічных фільмаў Галівуда. «Кніга джунгляў».
21.00. «Монстр». (Расія — ЗША). Фільм 2-гі «Тайная паліцыя Іосіфа Сталіна».
22.00. Весткі.
22.25. Спартыўная карусель.
22.30. Тэніс. Кубак Крамля.
23.00. Начны клуб Эс-Эн-Сі.

ТЭЛЕБАЧАННЕ

6 лістапада

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. Кінанастальгія. «Утаймавальніца тыграў».
10.20. Рэйтынг.
16.30. Мультфільмы.
17.25. «Запрашальны білет». Выступленне дзіцячага ўзорнага танцавальнага ансамбля «Фрэскі».
18.00. Каралеўскае паляванне. Шоў-казіно.
19.00. Абласныя навіны (Магілёў).
19.10. Налёт у непагоду. «Электромаш».
19.35. «Браслаўскія азёры».
19.40. Педагагічны экран. Прамая лінія.
20.40. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.25. Тэлебіржа.
21.35. На сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. Пасля заканчэння — Кінанастальгія. «Утаймавальніца тыграў»; НІКа.

Канал «Астанкіна»

9.05. Клуб падарожнікаў (з сурдаперакладам).
9.55. «Хітрыя Радзеса». 1—4-я серыі.
10.30. Амерыка з М. Таратутам.
11.00. Навіны (з сурдаперакладам).
11.20. «Месца сустрэчы змяніць нельга». 4-я і 5-я серыі.
14.00. Навіны (з сурдаперакладам).
14.25. Брыдж.
14.50. Бізнес-клас.
15.10. Уолт Дысней прадстаўляе...
16.00. «Фантазіі на тэму Фабержэ».
16.10. Цэнтр.
16.50. Прэс-экспрэс.
17.00. Навіны.
17.20. Жараб'ёўка лігі чэмпіёнаў Еўропы па футболу.
17.50. Чалавек і закон.
18.20. Амерыка з М. Таратутам.
18.50. Поле цудаў.
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.40. У «Клубе дэтэктываў». «КТБ-І» і канал «Франс інтэрнасьяналь» прадстаўляюць: «Валбатуны не змогуць прамаўчаць» з серыяла «Прыгоды прыватнага дэтэктыва Нестора Бурмы» (Францыя).
22.10. «ВІД» прадстаўляе: Паліт-бюро.
23.40. Музагляд. У перапынку (23.00) — Навіны.
23.45. Аўта-шоў.
24.00. Музычная гадзіна.
1.00. «Ехалі ў трамваі Ільф і Пятроў». Маст. фільм.

Канал «Расія».

9.20. Кіпрас Мажэйка. Рэпартажы з НАТО.
9.50. Студыя «Сатырыкон». «Таварышу Райкіну — акцёру і чалавеку».
11.00. «Санта-Барбара».
11.50. Варыяцыі на тэму ракако.
12.05. Іграе санкт-пецярбургскі аркестр «Класіка».
12.35. Т. Ін. Ка.
12.40. Сялянскае пытанне.
13.00. Весткі.
15.00. Тэлебіржа.
15.30. Тон-лабірынт.
16.00. Там-там-навіны.
16.15. «Сям'я Смірновых. Як жыць далей?» Тэлефільм.
17.00. М-трэст.
17.15. Крыніцы.
17.45. Уолт Дысней па пятніцах. «Дзікі Джэк». Мастацкі фільм. 1-я серыя.
18.35. «Стомлены, як сабака». Мультфільм.
18.45. Свята кожны дзень.
19.00. Весткі.
19.25. «К-2» прадстаўляе: «САС»; «Аса». Мастацкі фільм. 1-я серыя; Фрак народа.
22.00. Весткі.
22.25. Спартыўная карусель.
22.30. З залы Канстытуцыйнага суда Расіі.

7 лістапада

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. «Напярэдадні». Маст. фільм. 1-я серыя «Алена».
9.55. «Пра тое, як...» Музычны фільм.
10.05. Паказвае Гомель. Мастацкі відэаканал.
11.00. Тыдзень планеты.
11.15. Дзякуй вам, людзі! Мы ўсе ад дабрыні чужой залежым...
11.50. Мультфільмы.
12.25. «Восьмы колер вясёлкі». Фестываль дзіцячай творчасці ў Полацку.
13.05. Бізнес-клуб «Партнёр» прапануе.
14.25. Літарыянка.
15.00. Гандбол. Кубак ІГФ. СКА (Мінск) — «Колінска Славан» (Любляна, Славенія).
16.30. Сустрэча міністра абароны Рэспублікі Беларусь генерал-палкоўніка П. П. Казлоўскага з народнымі дэпутатамі-вайскоўцамі.
16.55. Хакей. Зборная Беларусі — зборная Украіны.
19.25. Опернае шоў з удзелам маладых спевакоў Беларусі і Арменіі.
20.40. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.25. Тэлебіржа.
21.40. «Сінема» прадстаўляе: «Эдыт і Марсель» (Францыя). 1-я і 2-я серыі.
23.55. НІКа.
0.10. У стылі «рэтра». Музычная праграма.

Канал «Астанкіна»

7.00. Навіны.
7.20. Раніцяя гімнастыка.
7.30. Спорт-шанц.
8.00. «Марафон-15» — малышам. «Вамсі» (Швецыя).
8.25. Бумеранг.
8.55. Экалагічная хроніка.
9.05. Медыцына для цябе.
9.45. Тэхнадром.
9.55. Тэлесерыял «АББГД ЛТД». 1-я серыя «Ідзі і вазьмі». 2-я серыя «Грошы знікаюць апоўдні».
10.45. Фільмы рэжысёра А. Габрыловіча. «Двары нашага дзяцінства». Фільм 1-ы.
12.00. Кінапраўда? «Вялікі грамадзянін». Фільм 1-ы.
14.00. Навіны (з сурдаперакладам).
14.25. Танцяна Тарасава і «Усе зоркі».
15.25. «У палоне натоўпу». Фільм 1-ы «Я — гэта мы».
15.55. У свеце жывёл.
16.35. Чырвоны квадрат.
17.15. Мультфільм. «Дракуліта-вампіраня» (Францыя).
17.40. Маст. фільм. «Цень, або Мабыць, усё абыдзецца». 1-я і 2-я серыі.
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.40. Брэйк-рынг.
21.30. «Шырэй круг, ці Шоў-круг з многімі невядомымі». У перапынку (23.00) — Навіны.
23.45. Трыятлон. Чэмпіянат свету. Перадача з Канады.
0.25. «Саламяны капялюшык». Мастацкі фільм. 1-я і 2-я серыі.

Канал «Расія»

7.00. Весткі.
7.25. «Мужчынскае выхаванне». Мастацкі фільм.
8.40. XX стагоддзе. «Хроніка дэманстрацыі».
9.00. Відэаканал «Плюс адзінаццаць».
10.15. Як жыць будзем?
11.00. «У агні няма броду». Мастацкі фільм.
12.30. «Стомлены, як сабака». Мультфільм.
12.40. Сялянскае пытанне.
13.00. Весткі.
13.20. Прысвячэнне С. Я. Лемешаву.
14.15. Дакументальная панарама.
15.00. Чэмпіянат Расіі па бальных танцах.
19.50. Футбол без граніц.
16.45. «Яно». Мастацкі фільм.
18.45. Свята кожны дзень.
19.00. Весткі.
19.20. Вуснамі дзіцяці.
19.50. Маскі-шоў.
20.20. «Мора смеху-92».
21.00. Зусім сакрэтна.
22.00. Весткі.
22.25. Спартыўная карусель.
22.30. Асарці.
23.00. Праграма «А».
23.30. Ад лібітум.
24.00. «Прэферанс па пятніцах». Мастацкі фільм.

ЗАПРАГРАМУЙЦЕ СВАЁ ЗАЎТРА... Dainova Co Ltd

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь,
Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь,
калектыў рэдакцыі газеты «Звязда».

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ.
Рэдакцыйная калегія: У. АНДРЫЕВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), І. БАРАНОЎСКІ, У. ГОЙТАН, В. ЖДАНКО, Л. ЛАХМАНЕНКА, М. МІХАЕВІЧ (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. МЯСНІКОЎ, Л. РЫЖАНКОВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. ЦІХАНОВІЧ, С. ШАЎЦОЎ.

НАШ АДРАС: 220041, гор. Мінск, праспект Ф. Скарыны, 77, рэдакцыя газеты «Звязда».
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная — 32-51-05, аддзела пісьмаў — 32-04-52, 32-41-92, навін —32-60-13, даведкі па рэкламе і аб'явах — 32-35-91.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі.
Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з чытачамі.

Друкарня выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Тыраж 81.098. Індэкс 63.850.
Зак. № 225.
Выходзіць 250 разоў на год.
Нумар падпісаны ў 21.00.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

ЧЫСЦІМ, МЫЕМ

Адбельвальнік не спрабавалі?

Як аднавіць белізну газавай пліты? Вопытныя гаспадыні прапануюць некалькі спосабаў.

Каб газавая пліта (і не толькі яна) зззяла белізной, яе чысцяць на ноч любым мыйным сродкам, які ёсць пад рукой, і замочваюць растворам адбельвальніка для бялізны. Раніцай змываюць вадой — газавая пліта, сантэхніка як новыя...

Некаторыя гаспадыні мыюць пліту пральным парашком, а замест анучы выкарыстоўваюць капронавую панчоху. Калі такой чыстцы пліта не паддаецца, можна адбяліць яе сумессю кашцы 5—8 таблетак гідрапірыту (ці растварыць у дзвюх лыжках вады), сталовай лыжкі нашатырнага спірту і чайнай лыжкі пральнага парашку. Карыстацца гэтым растворам трэба асцярожна. Анучку браць толькі пінцэтам ці апрацоўваць паверхню вакол камфорак пры дапамозе старога відэ